Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і КК КП(б)Б, ВЦВК і СНК БССР

САКАВІК 25 ПЯДЗЕЛЯ 1934 г. № 66 (4899) Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцесь!

Москва Старая Площадь 4 ЦК ВКП(б) Орг. Инстр. Отдел по 1934 г. Звезда

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР І ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА ВКП(б) АБ ПЛАНАВАННІ ПЕРАВОЗАК І ПАЛЯПШЭННІ РАБОТЫ МЯСЦОВЫХ ОРГАНАЎ НКШЗ.

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — ТАВАРАПРАВОДЗЯЧАЯ СЕТКА БССР ПРАЦУЕ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА.

НАРЫС: А. СТАХОВІЧ — БРЫГАДЗІРША.

ПРАТЭСТ ГЕНЕРАЛЬНАГА КОНСУЛА СССР У ХАРБІНЕ ТАЛ СЛАВУЦКАГА СУПРОЦЬ ПАГОРШАННЯ АБЫХОДЖАННЯ З АРЫШТАВАНЫМІ СОВЕЦКІМІ ГРАМАДЗЯНАМІ.

ЗА МЯЖОЮ:

АБМЕН «АСАБІСТЫМІ ПІСЬМАМІ» ПАМІЖ ХІРОТА І ХЕЛЛАЙ ВОДГУКІ СУСВЕТНАЙ ПРЭСЫ.

ТАВАРАПРАВОДЗЯЧАЯ СЕТКА БССР ПРАЦУЕ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА

«Для таго, каб эканамічнае жыцьцё краіны магло забіць ключом, а прамысловасць і сельская гаспадарка мелі стымул к далейшаму росту сваёй прадукцыі, трэба мець яшчэ адну ўмову, а іменна — разгорнуты ТАВАРАЗВАРОТ паміж горадам і вёскай, паміж раёнамі і абласцямі краіны, паміж рознымі галінамі народнай гаспадаркі» (СТАЛІН). Так ахарактарызаваў значэнне тавараазвароту ў сваім гістарычным дакладзе на XVII з'ездзе ВКП(б) тав. СТАЛІН.

Яшчэ ў 1927 г. тав. Сталін папярэджваў, што «нам трэба наладзіць такі перадатачны размеркавальны апарат паміж горадам і вёскай, які-б быў здольны ўлічыць і задаволіць патрабаванні горада і вёскі ўсёй краіны, таксама, як кожны чалавек улічвае ў сабе свой бюджэт, свае расходы і даходы».

Вызначыўшы значэнне тавараазвароту для народнай гаспадаркі, тав. Сталін на XVII з'ездзе ВКП(б) побач з гэтым указаў і канкрэтныя формы і метады работы, пры дапамозе якіх трэба палепшыць тавараазварот, — актуальнейшую задачу, «без вырашэння якой немагчыма далей рухацца наперад».

Як у нас, у БССР, вырашаецца гэта задача?

Месяц назад адбыўся ўсебеларускі з'езд спажывецкай кааперацыі. На з'ездзе кіраўніцтва Белкаапсаюза і дэлегаты з'езда сказалі нямала моцных слоў аб сваёй нікуды не вартай рабоце. Сістэматычнае недавыкананне планаў тавараазвароту, зусім нездавальняючая арганізацыя самазакупак, перавышэнне норм тавараных астач, растраты і побач з усім гэтым цяжкае фінансавае становішча — вось пакзальнікі, якія характарызуюць тавараазварот спажывецкай кааперацыі.

З'езд прызнаў работу Белкаапсаюза нездавальняючай. Перад новым праўленнем пастаўлены задачы — выправіць ранейшыя недахопы і перабудаваць работу з тым, каб забяспечыць найхутчэйшае прасоўванне тавараў ад прамысловасці да спажыўца.

Недахопы, характарызуючыя работу спажывецкай кааперацыі, цалкам адносяцца і да Дзяржгандлю.

Мінуў месяц. Гэты месяц быў надзвычай адказным для разгортвання тавараазвароту. Спажывецкая кааперацыя за гэты час павінна была прывесці сваю нізоўку ў такое становішча, каб яна змагла добра і поўнасцю задаволіць узросшыя запатрабаванні рабочых горада, калгасаў і напаўнаўнаў нездаволенай сасновай слугы.

Аднак, трэба з усёй рашучасцю падкрэсліць, што мінулы месяц пасля з'езда кааперацыі не дал малежнага пералому ў рабоце тавараправодзячай сеткі.

Аб гэтым красамоўна гавораць матэрыялы, якія друкаваліся раней і друкуюцца сёння ў «Звяздзе». Аб гэтым вельмі рэзка, але правільна сігналізавала «Правда».

Гэта-ж факт, што цэлы рад міжраённых баз на сёнешні дзень з'яўляюцца ТАВАРАЗАТРЫМЛІВАЮЧЫМІ пунктамі, а не арганізацыямі, паляпшаючымі тавараазварот і ўкарочваючымі шлях прасоўвання тавару да спажыўца. Гэта-ж факт, што і па сёнешні дзень тавараазварот райсаюзаў міжраённыя базы лімітуюць, не патрабаваннямі спажыўцоў, а канцылярска-бюракратычнымі габінетнымі КАЭФІЦЫЕНТАМІ.

Толькі гэтым і можна вытлумачыць тое, што многія кааператыўныя арганізацыі затаварываюцца адными таварамі пры адсутнасці іх у іншых гандлюючых арганізацыях. Толькі гэтым і можна вытлумачыць факт, калі бабруйская міжраённая база засылае райсаюзам тавары, на якія няма попыту.

Што гаварыць аб міжраённых базах, калі нават Белкаапсаюз замест задавалення запатрабавання сельскага райспажыўсаюза аб занараджанні яму 5 вагонаў крэйды на працягу некалькіх месяцаў настойлівае навязвае вапну. А ці толькі гэта з сельскім райсаюзам? У тым-жа Бабруйску мыла і запалак «днём з агнём не знойдзеш», а на міжраённай базе запажы гэтага тавару.

Ёсць факты, калі асобныя кааператары літаральна ігнаруюць самазакупкі і займаюцца выключна механічным размеркаваннем планавых фондаў. Ёсць і такія арганізацыі, ад дзейнасці якіх вельмі патыхае СПЕКУЛЯЦЫЙНЫМ ДУШКОМ. У гэтым асаблівае праяўляе сябе БЕЛГАНДАЛЬ. У яго адкрытых магазінах цэны на тавары лімітуюцца не адпускнымі, цвёрдымі цэнамі, устаноўленымі адлаведнымі арганізацыямі, а жаданнем кіраўнікоў больш зарабіць. Для іх не важна, калі, напрыклад, на адны і тыя-ж кансервы ў магазінах сёння ўстаноўлены цэны ў 9 руб. 40 кап. за банку, а назаўтра гэтыя-ж кансервы прадаюцца па 5 руб. і т. д.

Вельмі абураючай з'явай у рабоце кааперацыі і па сёнешні дзень застаюцца растраты, сума якіх па сістэме Белкаапсаюза дасягнула 2 з паловай млн. руб. 56 райсаюзаў, якія прадставілі справаздачу, мінулы год скончылі з шматтысячнымі стратамі.

Гэтымі днямі СНК БССР разглядаў пытанне аб тавараазвароце і прызнаў зусім нездавальняючай гандлёвую работу Белдзяржгандля. Кіраўніцтва Белгандля сваю бяздзейнасць і злачынную безгаспадарчасць прыкрывала «дутымі», «очковтирательскими» балансамі, утаіўшымі фактычнае зніжэнне зваротных сродкаў Белгандля на суму каля 2 млн. руб.».

СНК БССР абвясціў дырэктару Белгандля т. СЯМЁНАВУ суровую вымову за дрэнную пастаноўку работы Белдзяржгандля і прапанаваў пракурору рэспублікі тэрмінова выявіць вінаватых у складанні дутых балансаў і прыцягнуць іх да судовай адказнасці.

Разам з гэтым СНК БССР прызнаў зусім нездавальняючай гандлёвую работу сістэмы Белкаапсаюза. Яго работа па-ранейшаму характарызуецца слабым разгортваннем совецкага гандлю, механічным размеркаваннем тавараў, іх затрыманнем у аптовых звеннях. СНК прапанаваў БНС неадкладна прыняць практычныя меры да наладжання гандлёвай работы ўсёй сістэмы ў самы кароткі тэрмін, праверыць наяўнасць лішкаў тавараў і пераразмеркаваць іх у адпаведнасці з патрэбай рынка.

З гэтага рашэння павінны быць зроблены належныя вывады ўсімі гандлюючымі арганізацыямі. «Задача павышэння матэрыяльнага ўзроўню жыцця рабочых і сялян патрабуе усяго мернага разгортвання тавараазвароту на аснове павялічанай вытворчасці прамысловых тавараў шырокага спажывання і паляпшэння снабжэння горада сельска-гаспадарчымі прадуктамі» (з пастановы XVII з'езда ВКП(б) аб задачах другой пяцігодкі).

Пытанне тавараазвароту раённыя камітэты партыі павінны ўзяць пад свой непасрэдны сістэматычны кантроль. Нельга разглядаць совецкі гандаль «як другарадную нявартую справу». Падобным поглядам т. СТАЛІН даў вельмі ясную ацэнку. «Гэтыя людзі, відавочна, не разумеюць, што сваімі высокамернымі адносінамі да совецкага гандлю яны выяўляюць небольшэвіцкія погляды, а погляды захудалых дваран, маючых вялікую амбіцыю, але пазбаўленых усякай амуніцыі».

Прыведзеныя факты з работы Белгандля і Белкаапсаюза гавораць, што характарыстыка тав. Сталіна цалкам і поўнасцю адносіцца да гандлёвых арганізацый БССР. «Захудалыя дваране» яшчэ моцна засеялі ў гандлюючых апаратах, і тармозяць выкананне рашэнняў партыі. На барацьбу за разгортванне тавараазвароту павінны мабілізавацца ўсе партыйныя арганізацыі. Ключом да вырашэння гэтых задач з'яўляецца даклад тав. Сталіна і пастановы 17 з'езда.

НА ДАПАМОГУ ЧЭЛЮСКІНЦАМ

ЛЕНІНГРАД, 23 (БЕЛТА).

Ледакол «Красін» у 22 гадзіны 20 мін. зняўся з якара і вышаў у мора ў паход для выратавання чэлюскінцаў.

ВЛАДЗІВАСТОК, 23 (БЕЛТА). Параход «Смоленск», пакінуўшы самалёты ў Олюторцы, зняўся з якара і зараз ідзе на поўнач.

ХАБАРАЎСК, 23 (БЕЛТА).

З Анадыра паведамляюць, што тры самалёты «Р-4», вылецеўшыя з Олюторкі 21-га сакавіка, учора ў 12 гадзін апусціліся ў Анадыры-Лімане.

У гутарцы начальніка эскадрыльі тав. Каманін заявіў: «З Олюторкі вылецела 5 самалётаў. Праз 5 гадзін яны ўдачна апусціліся ў Майн-Пыльгіне. Ішлі пры моцным сустрэчным ветры. Скорасць 70 клм. у гадзіну.

З Майна-Пыльгіна вылецелі 4 самалёты (адзін астаўся для рамонту і затрымаецца на суткі). Праз 30 мін. пасля старта адзін з вылеценых самалётаў па невядомых прычынах вярнуўся назад у Майна-Пыльгін. Пагода ў вогуле спрыяючая.

Пры пералёце праз Пальскі хрыбет мы папалі ў суцэльную воблачнасць і падняліся на вышыню ў 1500 метраў.

23-га сакавіка ў выпадку спрыяючай пагоды мы вылятаем праз Анадырскі хрыбет у Ванкарэм, дзе знаходзіцца Ляпідзеўскі. Машыны ў поўнай спраўнасці. Становішча экіпажа бадзёрае. Прыбыўшыя ў Анадыр самалёты з захапленнем сустракала ўсё насельніцтва. Для прыёму аэрапланаў асоавіяхімаўцы загадзя падрыхтавалі добрую пляцоўку.

Тэлеграма начальніку ГУГВФ тав. Уншліхту ад п. Філіповіча

Начальнікам Галоўнага кіраўніцтва грамадзянскага паветранага флота т. Уншліхтам атрымана наступная тэлеграма ад начальніка дэпартамента грамадзянскага флота Польшчы п. Філіповіча:

«Польскі грамадзянскі паветраны флот са здзіўленнем сочыць за гераічнай барацьбой совецкіх лётчыкаў у перамаганні морскай і паветранай стыхіі далёкай Арктыкі. Польская авіяцыя не пахісна верыць у перамогу, сілу духу і волі совецкіх герояў.

Няхай жывуць піонеры — пераможцы паўночных морскіх і паветраных шляхоў для дабра ўсяго чалавецтва!

Няхай жывуць гераічныя совецкія лётчыкі!

Начальнік дэпартамента грамадзянскага паветранага флота — ФІЛІПОВІЧ».

АБ ПЛАНАВАННІ ПЕРАВОЗАК І ПАЛЯПШЭННІ РАБОТЫ МЯСЦОВЫХ ОРГАНАЎ НКШЗ

Пастанова Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б)

1. Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) устанаўляюць, што недахопы, адзначаныя ў пастанове аб рабоце Данецкай дарогі, з'яўляюцца тыповымі для ўсіх чыгунак СССР. З-за месніцкіх і карыслівых пабуджэнняў робяцца няпланавыя перавозкі другачарговых грузаў на шкоду перавозкам агульна-дзяржаўнага значэння. Да гэтага часу яшчэ не зжыт канцылярска-бюракратычны метад кіраўніцтва, няведанне кіраўнікамі дарог і экспліатацыйных раёнаў сапраўднага становішча на станцыях — гэтых рашаючых вагарах перавозак. Многія з комуністаў не толькі не даюць узораў дысцыпліны, а, наадварот, самі часта з'яўляюцца прыкладам разладжанасці і недысцыплінаванасці, што вядзе к дэзарганізацыі работы на транспарце.

2. Адной з важнейшых прычын дрэннай работы чыгунак з'яўляецца нездавальняючая сістэма планавання на дарогах і дрэнная работа эксплаатацыйных раёнаў і станцый па выкананню планаў.

Планы перавозак складаюцца цэлым рядам органаў НКШЗ і міжведамственнымі арганізацыямі — раённымі кіраўніцтвамі аператыўнага планавання і рэгулявання перавозак пры НКШЗ (РУПР'амі), міжведамственнымі нарадамі пры іх. Мясцовымі нарадамі па перавозках пры выканкомах і соўпаркомах саюзных і аўтаномных рэспублік (МСП), камітэтамі па перавозках пры выканкомах, якія адарваны ад аператыўнай работы чыгунак і ўмешваюцца праз галаву начальнікаў дарог у работу раёнаў і станцый. Тым часам начальнікі дарог, абавязаныя выконваць план перавозак, стаяць у баку ад яго складання, адпекваюцца ад адказнасці за яго змест.

У рэзультаце гэтага дрэнна скарыстоўваецца рухомы састаў, сустрэчныя перавозкі дасягаюць вялікіх размераў, недапушчальна кепска скарыстоўваюцца вагоны, якія ідуць у парожнім напрамку.

Як начальнікі дарог і раёнаў, так і самі плануючыя органы ў сваёй штодзённай практыцы вельмі часта ламаюць планы, што прыводзіць да бяспланавасці і безадказнасці ў справе перавозак на станцыях, у раёнах, на чыгунках і ў НКШЗ.

3. Не гледзячы на скарачэнне праў і абавязкаў эксплаатацыйных раёнаў пасля пастановы СНК і ЦК ад 3-8-га ліпеня 1933 г., яны захавалі яшчэ многа функцый, якія не маюць ніякіх адносін да кіраўніцтва рухам. Эксплаатацыйныя раёны ў іх цяперашнім выглядзе ператварыліся на справе ў фактар, які затрудняе правільнае кіраўніцтва рухам з боку начальнікаў дарог і станцый, з прычыны чаго неабходна іх ператварыць у аддзяленні службы эксплаатацыі.

4. Начальнікі станцый, атрымлі ваючы шматлікія супярэчлівыя планы, загады і заданні, працуюць бяспланава. На станцыях, асабліва, буйных таварных і сартыровачных, усё яшчэ не ліквідаваны арганізацыйная неразбярыха, награмаджэнне шматлікіх бюро, награмаджэнне сектароў, пасад.

Начальнікі станцый перакладаюць сваю работу і адказнасць на намеснікаў і памочнікаў, самі фактычна ўхіляюцца ад адказнасці, заняты кіраўніцтвам «наогул», пасяджэннямі і прадстаўніцтвам у розных грамадскіх арганізацыях, і ў лепшым выпадку выконваюць функцыі штурхачоў па фармаванню паяздоў.

Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

I. АБ ПЛАНАВАННІ ПЕРАВОЗАК

1. Скасаваць: а) раённыя кіраўніцтвы НКШЗ па планаванню і рэгуляванню перавозак (РУПР'ы); б) міжведамственныя нарады пры РУПР'ах; в) мясцовыя нарады па перавозках пры краявых і абласных выканкомах і пры советах народных камісараў саюзных і аўтаномных рэспублік; г) краявыя і абласныя камітэты па перавозках.

2. Ускласці складанне гадавога, квартальных і месячных планаў перавозак па ўсёй чыгуначнай сетцы СССР на Народны Камісарыят шляхоў зносін з прадстаўленнем гэтых планаў на зацвярджэнне Совета працы і абароны Саюза ССР.

3. Абавязаць начальнікаў дарог складаць планы перавозак па аддзяленнях службы эксплаатацыі і станцыях дарогі ў адпаведнасці з планам, зацверджаным Советам працы і абароны і асабіста падпісваць планы, даваемыя аддзяленням.

4. Абавязаць начальнікаў аддзяленняў службы эксплаатацыі па атрыманні планаў ад начальнікаў дарог за сваім асабістым подпісам накіроўваць гэтыя планы начальнікам станцый, забяспечваючы ў парадку штодзённага кіраўніцтва дакладнае іх выкананне.

5. Арганізаваць пры Народным камісарыяце шляхоў зносін і пры начальніках дарог у якасці дарадчых органаў пастаянныя нарады па перавозках: у НКШЗ з прадстаўнікоў наркаматаў, пры начальніках дарог—з прадстаўнікоў мясцовых выканкомаў і гаспадарчых органаў.

6. Падзяліць план перавозак на 2 катэгорыі: да першай катэгорыі аднесці грузы агульна-дзяржаўнага значэння, плануемыя НКШЗ у цэнтралізаваным парадку; да другой катэгорыі аднесці грузы мясцовага значэння, плануемыя начальнікамі чыгунак.

7. Да грузаў агульна-дзяржаўнага значэння (1-й катэгорыі) аднесці: вугаль, кокс, нафту, торф, дровы (па спецыяльнаму спісу, устаноўленаму СПА пры зацвярджэнні плана), руду, флюсы, агнеўпоры, чорныя металы і металалом, металавырабы і машыны, с.-г. машыны, трактары, аўтамабілі, хімічныя ўгнаенні, лес, будаўнічыя матэрыялы, прызначаныя для прадпрыемстваў агульна - дзяржаўнага значэння, згодна спецыяльна ўстанаўляемага СПА спісу, цэмент, бавоўну, паперу, буракі, зарно, цукар, спірт, расліннае масла, соду, соль, мяса, рыбу, жыўнасць (убойную і племянную) цэнтралізаванага снабжэння, аб'ёмісты фураж па асобнаму спісу, устанаўляемаму СПА, лён, пяньку, промсыравіну, бульбу і гародніну (у перыяд сезонных загатовак: верасень, кастрычнік, лістапад), тавары шырокага ўжытку, спіс якіх павінен быць перагледжан і зацверджан СПА, вайсковыя ў межах зацверджанага плана, унутры-транспартныя перавозкі НКШЗ (рэйкі, шпалы, металы, змацаванні, запасныя часткі, апал і лес).

Усе астатнія грузы (камбінаваныя кармы, плодагародніна, макуха, віно, патака, мясцовыя будматэрыялы, дробныя грузы і інш.) аднесці да перавозак мясцовага значэння (2-я катэгорыя).

8. Зацвердзіць наступны прадстаўлены НКШЗ план размеркавання вагонаў па грузах 1-й і II-й катэгорыі на красавік 1934 г. па дарогах СССР.

НАЗВА ДАРОГ	Агульны план груз. на красавік	У тым ліку Грузы 1-й катэгорыі	Грузы II-й катэгорыі	Розарв НКЗШ
Маскоўска-Казанская	2.700	2.265	385	50
Маскоўска-Курская	2.700	2.502	168	30
Маскоўска-Акружная	400	359	11	30
Паўночная	3.000	2.675	295	30
Разана-Уральская	1.100	995	90	15
Окцябрская	3.300	2.700	560	40
Мурманская	1.500	1.313	172	15
МББ	1.700	1.464	206	30
Заходняя	2.100	1.738	322	40
Паўднёва-Ўсходняя	2.700	2.418	252	30
Паўночна-Каўказская	3.700	3.500	160	40
Екацерынінская	6.500	6.230	255	15
Данецкая	8.200	7.905	270	25
Паўднёвая	1.200	1.098	75	27
Паўднёва-Заходняя	2.700	2.369	301	30
Закаўказская	1.800	1.665	120	15
Сярэдня-Азіяцкая	1.300	1.195	75	30
Турксіб	250	200	40	10
Самара-Златаустаўская	1.000	835	150	15
Пермская	3.850	3.494	341	15
Омская	1.200	1.080	105	15
Томская	2.975	2.850	110	15
Кузбаская	25	15	7	3
Забайкальская	850	780	60	10
Усурыйская	1.250	1.135	110	5
Усяго на сетцы	58.000	52.780	4.640	580

9. Абавязаць НКШЗ і начальнікаў дарог уключаць у план перавозак грузы, якія следуюць у парожнім напрамку.

10. Абавязаць начальнікаў дарог пры складанні плана перавозак забяспечыць максімальнае павелічэнне маршрутызацыі перавозак, не дапускаючы распылення грузаў кліентурай, а НКШЗ у дэкадны тэрмін даць заданне па маршрутызацыі перавозак кожнай дарозе ў паасобку.

11. Даручыць НКШЗ у дэкадны тэрмін выпрацаваць новае палажэнне аб адказнасці дарог і кліентуры за несвоечасовае выкананне плана пагрузкі і разгрузкі і ўнесці яго на зацвярджэнне СНК Саюза ССР.

12. Скасаваць існуючы парадак учота, пры якім пагрузка звыш ся рэднесутачнай нормы, хоць і ў межах агульнага месячнага або пяцідзённага плана, лічыцца няпланавай пагрузкай.

13. Папярэдзіць начальнікаў дарог і нач. аддзяленняў службы эксплаатацыі, што невыкананне заданняў па звароту і перадачы вагонаў на іншыя дарогі будзе разглядацца, як злачынства супроць дзяржавы, якое цягне за сабой крымінальную кару.

14. У адпаведнасці з данай пастановай скасаваць:

а) пастанову СПА ад 11-VIII-30 г. аб зацвярджэнні палажэння аб мясцовых нарадах па перавозках (з. з. СССР 1930 г., № 44, арт. 458, 459);

б) пастанову СПА ад 23-VIII-31 г. аб арганізацыі органаў аператыўнага планавання перавозак (з. з. СССР 1931 г., № 57, арт. 369);

в) правілы прыёму грузаў к перавозцы ад 2-га студзеня 1930 г. (дадатак да арт. 50 статута чыг.);

г) пастанову СПА ад 25-IX-32 г. № 1209, якая дае права адправіцелю за 3 дні да пачатку дэкады знімаць грузы з плана, заяўленага к перавозцы ў любой колькасці;

д) пастанову СНК СССР ад 26-IX-33 г. аб стварэнні цэнтральнай нарады па перавозках пры НКШЗ.

II. АБ АРГАНІЗАЦЫІ АДДЗЯЛЕННЯЎ СЛУЖБЫ ЭКСПЛААТАЦЫІ

1. Рэарганізаваць існуючыя кіраўніцтвы эксплаатацыйных раёнаў У АДДЗЯЛЕННІ СЛУЖБЫ ЭКСПЛААТАЦЫІ. Вызваліць начальнікаў аддзяленняў службы эксплаатацыі ад інспектарскіх функцый у адносінах іншых служб, поўнасцю захаваўшы за імі, як асноўную іх работу, вядзенне работы па руху ў межах аддзялення і аператыўнае распараджэнне ўсімі сродкамі руху (паравозы, вагоны, сродкі і т. п.), прадастаўляемымі іншымі службамі для перавозак.

2. Устанавіць, што нач. аддзялення службы эксплаатацыі назначаецца нач. дарогі па прадстаўленню нач. службы эксплаатацыі і зацвярджаецца наркомам шляхоў зносін, пры гэтым кіравацца тым правілам, што нач. аддзялення службы эксплаатацыі могуць быць толькі работнікі, якія маюць тэхнічныя веды ў аб'ёме, устаноўленым НКШЗ незалежна ад таго, з'яўляюцца яны членамі ВКП(б) ці не з'яўляюцца.

3. Абавязаць нач. аддзялення эксплаатацыі асабіста распрацоўваць практычныя мерапрыемствы па ажыццяўленню дзяржаўнага плана перавозак, атрымліваемага імі з кіраўніцтва дарогі, і за сваімі подпісам даваць месячныя планы перавозак і пяцідзённыя загады-заданні па станцыях.

4. Скасаваць цяпер існуючыя эксплаатацыйных раёнах пасады другога памочніка па камерцыйнай частцы, інспектароў па паравозах, вагонах, пуці, сувязі і рабочаму снабжэнню, камерцыйную частку, пасажырскую частку, рахункова-фінансавую і спецыяльную частку з пераводам вызваліўшыхся работнікаў на работу на станцыі і дарогі, у дыстанцыі, у вагонныя участку.

Устанавіць наступную структуру аддзялення службы эксплаатацыі: начальнік, памочнік начальніка па грузавой частцы, рэвізор па руху, камерцыйныя рэвізоры, рэвізор-інспектар па хлада-транспарту, дыспетчэрская частка, тэхнічная частка, загадчык кандуктарскіх брыгадамі і кантора аддзялення.

III. АБ РАБОЦЕ СТАНЦЫІ

1. Палажыць у аснову работы станцыі месячны план, які атрымліваецца станцыяй за асабістым подпісам начальніка аддзялення эксплаатацыі. Абавязаць начальнікаў аддзяленняў эксплаатацыі, у адпаведнасці з месячным планам, за асабістым подпісам, даваць станцыям на кожную пяцідзённую загад-заданне на пагрузку, разгрузку панумарнога назначэння паяздоў па пастаянна дзействуючых графіках і рэгуліровачныя заданні па выкідцы паражняка, з правам у асабліва неабходных выпадках рабіць сутачную карэктыроўку абавязковага пяцідзённага загада-задання.

2. Абавязаць начальнікаў аддзяленняў эксплаатацыі даваць на станцыю месячны план не пазней, чым за тры дні да пачатку месяца, пяцідзённы загад-заданне не пазней двух дзён да пачатку пяцідзённі і рабіць даваемыя ў асаблівых выпадках сутачныя карэктыроўкі не пазней, чым за тры гадзіны да пачатку сутак.

3. Абавязаць начальнікаў станцый неадкладна ўстраніць наяўныя да гэтага часу шматлікія скажэнні і злоўжыванні ва ўліку і справаздачнасці па наяўнасці вагонаў на станцыі і скарыстанню рухомага састава. Ускласці на начальнікаў станцыі персанальную адказнасць за правільнасць уліку наяўнасці вагонаў і іх скарыстанне.

4. Устанавіць, што ўсе ўказанні нач. станцыі па ўтрыманню ў спраўным стане і чыстаце станцыйных прылад і памяшканняў, па акуратнай і чоткай рабоце манеўровых брыгад, спраўнаму ўтрыманню семафораў, стрэлак, станцыйных пуцей і сродкаў сувязі — з'яўляюцца безумоўна абавязковымі для працуючых на тэрыторыі станцыі агентаў другіх служб: дарожных мастроў, наглядчыкаў будынкаў, тэхнічных аглядчыкаў, манеўровых машыністаў, манцёраў сувязі і т. д.

Прадаставіць права нач. станцыі накладаць адміністрацыйныя спагнанні на пералічаных вышэй агентаў у выпадках невыканання імі ўказанняў начальнікаў станцый з паследуючым давядзеннем аб гэтым да ведама начальнікаў адпаведных служб.

5. Падначаліць аператыўна начальнікам станцый стрэлкавую ахову, якая знаходзіцца на тэрыторыі станцыі, з правам размяшчэння пастоў аховы на погляд нач. станцыі.

6. Перадаць у веданне нач. станцый жылыя памяшканні, выдзеленыя для размяшчэння станцыйных работнікаў, і ўсе станцыйныя і службовыя будынкі з ускладаннем на іх адказнасці за ўтрымане ў парадку гэтых будынкаў. НКШЗ прадаставіць у распараджэнне начальнікаў станцый неабходныя грашовыя сродкі пад справаздачнасць.

7. Забараніць усім мясцовым партыйным, совецкім і гаспадарчым арганізацыям выклікаць нач. станцыі без дазволу нач. аддзялення на нарады і даклады, рабіць абследаванні іх работы, а таксама рабіць мабілізацыю станцыйных транспартных сродкаў.

8. Прапанаваць НКШЗ у 2-кадны тэрмін прадставіць на зацвярджэнне СНК СССР палажэнне, структуру і штаты грузавой, сартыровачнай, участковай і прамежнай станцыі.

***

Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) лічаць, што работа чыгуначнага транспарта не можа быць палепшана і чыгуначны транспарт не можа быць выведзен на шырокую дарогу належнага абслугоўвання народнай гаспадаркі без ліквідацыі той расхлябанасці, безгаспадарчасці і безадказнасці, які ўсё яшчэ ліхарадзяць транспарт.

Аднаўленне і ўмацаванне дысцыпліны на транспарце як «унізе», так і «ўверсе» з'яўляецца тым асноўным звяном, праз дапамогу якога можна толькі паставіць на ногі наш чыгуначны транспарт. Галоўная віна за расхлябанасць і адсутнасць належнай дысцыпліны на транспарце кладзецца на комуністаў. Комуністы-чыгуначнікі павінны быць узорам жалезнай большэвіцкай дысцыпліны на транспарце. На справе, аднак, многія комуністы з'яўляюцца менш дысцыплінаванымі, чым беспартыйныя работнікі чыгуначнага транспарта, а некаторыя з іх даходзяць у сваёй недысцыплінаванасці да таго, што іх трудна адрозніць ад «очковтирателей», дэзарганізатараў і шкоднікаў.

Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) патрабуюць, каб усе чэсныя комуністы-чыгуначнікі сталі на чале руху за аднаўленне і ўмацаванне жалезнай дысцыпліны на транспарце, каб яны штодзённа, штогадзінна давалі ў сваёй рабоце высокія ўзоры большэвіцкай дысцыпліны.

Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) папярэджваюць разам з тым усіх скрытых і нявыяўленых яшчэ «очковтирателей» і дэзарганізатараў з комуністаў, што партыйны білет не выратуе іх ад караючай рукі партыі і ўрада, якая не спыніцца перад тым, каб расправіцца з імі, як з дэзарганізатарамі чыгуначнага транспарта, як з ворагамі совецкай дзяржавы.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР **В. МОЛАТАЎ**

Сакратар Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) **І. СТАЛІН**

23 сакавіка, 1934 года.

РЭЙД ПРАВЕРКІ РЭАЛІЗАЦЫІ РАШЭННЯЎ XVII З'ЕЗДА ПАРТЫІ АБ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

„Праблема жывёлагадоўлі з'яўляецца зараз такой-жа першачарговай праблемай, якой была ўчора ўжо вырашаная з поспехам праблема зернавая" (СТАЛІН)

РАЗГОРНЕМ УСЕБЕЛАРУСКІ ПАХОД НА ЛЕПШУЮ ЖЫВЁЛАГАДОЎЧУЮ ФЕРМУ

ЦЭНТРАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ КП(б)Б— т. ГІКАЛО

Ліст калгаснікаў калгаса „Чырвоная зорка", Барысаўскага раёна

Мы з вялікай увагай прачыталі і абгаварылі на агульным сходзе пастанову Цэнтральнага Камітэта КП(б)Б «Аб заметках у газеце «Социалистическое земледелие». Гэта пастанова зусім правільная і большэвіцкая. Мы падрабязна азнаёміліся з матэрыяламі судовага працэса ў КАСЦЮКОВІЦКІМ раёне над знішчальнікамі жывёлы і з прыгаворам Вярхоўнага суда, які поўнасцю ўхваляем.

Мы нядаўна распрацавалі даклад нашага любімага правадыра і першага калгаснага брыгадзіра тав. СТАЛІНА на XVII з'ездзе ВКП(б). З асаблівай увагай мы абгаварылі тую частку даклада тав. СТАЛІНА, дзе ён гаворыць аб жывёлагадоўлі. Наш калгас у 1932 г. па жывёлагадоўлі таксама меў вялікія страты. Тут была работа кулака і яго ахвосця.

У 1933 г. мы значна ўмацавалі жывёлагадоўлю ў нашым калгасе. У нас сёлета 74 каровы, з іх 40 галоў маладняка (план кароўнага стада 75), 125 свіней (паводле плана—120), 57 авец і 71 конь. Ёсць і вытворнікі: 1 жарабец, 2 племянных быкі, 3 боравы і 2 бараны. Такім чынам у нас ёсць усе магчымасці, каб зрабіць гэты год годам далейшага пералома ў развіцці жывёлагадоўлі ў нашым калгасе.

Мы дабіліся таго, што наша калгасная свінатаварная ферма дала 10 тысяч рублёў прыбытку. За тры месяцы бягучага года з нарадзіўшыхся 70 штук парасят, папа толькі адно парасё. Дзяржаўныя мясапастаўкі 1933 г. мы выканалі выключна свіным мясам. Апрача гэтага прадалі вкружаючым калгасам і калгаснікам 150 свіней. Наша СТФ стала даходнай галіной калгаснай гаспадаркі. Гэтага мы дабіліся ў выніку барацьбы за ажыццяўленне позунга тав. СТАЛІНА «зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі».

Для догляду за жывёлай мы выпучылі нашых лепшых калгаснікаў-ударнікаў: КРУГЛІКА, ЗАБЕЛО, ДУБЕНЯ, ГУЛЬКО, КАЗЫРА, НАВІЦКАГА і інш. На жывёлагадоўчых фермах дабілі абязлічку, увялі здельшчыну; у каго ў брыгадзе лепшая жывёла і ў каго захаваўся прыплод—той калгаснік атрымлівае і больш працадзён.

Развіваем жывёлагадоўлю ў кожнага калгасніка. У канцы 1932 г. было 46 бескароўных калгаснікаў, а цяпер у кожнага калгасніка ёсць карова або цёлка.

Наш калгаснік Круглік у мінулым быў батраком, бескароўным. Цяпер ён мае карову, 4 свіней, 6 вутак, 12 кур. А сёлета ён выгадуе яшчэ і цёлку. Тое-ж самае можна сказаць і пра нашых калгаснікаў Мірука, Трасніцкага і інш.

Вітаем рашэнні ЦК КП(б)Б, накіраваныя на ўзмацненне барацьбы за развіццё социялістычнай жывёлагадоўлі. Ганьба тым калгаснікам, якія дрэнна абыходзяцца з калгасным калнём. У нас усе коні сярэдняй і вышэй сярэдняй упітанасці. Мы калгаснага каня беражэм як сваё вока, бо добра разумеем, што моцны калгасны конь—зарука перамог на социялістычных палёх.

У гэтым годзе пабудавалі цёплы хлеў для свіней на 200 штук і канюшню на 48 галоў.

У нас ёсць усе магчымасці для далейшага роста жывёлагадоўлі. «1934 год павінен і можа стаць годам пералома к пад'ёму ва ўсёй жывёлагадоўчай гаспадарцы» (СТАЛІН). Гэта ўказанне нашага дарагога тав. СТАЛІНА, які ўпэўнена вядзе нас наперад да заможнага калгаснага жыцця, выканаем не пакпадаючы рук.

Мы абавязваемся ў 1934 г. дабіцца наступнага:

Кожны калгаснік бярэ на сябе социялістычны абавязак выгадаваць і прадаць калгасу цёлку;

стварыць па конях племяны табун з 12 матак, аднаго вытворніка і 13 штук маладняка;

мець да канца года ў калгасе наступнае пагалоўе жывёлы: коняй 80 галоў, буйнай рагатай жывёлы—90, свіней — 125, авечак—80;

абавязваемся злучыць 100 проц. матак з вытворнікамі палепшаных парод: кабыліц—з вытворнікам «Арданам», кароў з вытворнікамі яраслаўскай пароды, свіней з вытворнікамі іаркшырскай пароды і авец з баранамі валожскай пароды.

Устанавіць здельную аплату ў залежнасці ад прыплода і ўдоя; за кожную злучку маткі, за кожныя нармальныя роды і гадоўлю маладняка напічаць звыш устаноўленай аплаты; практыкаваць штрафы працаднямі за зрыў злучкі, абартаванне і падзеж маладняка;

арганізаваць спецыяльныя выгулы для цялят і свіней, а для дарослых парасят—канюшынныя выпасы;

штодзенна чысціць коняй і ўсіх вытворнікаў і не радзей двух раз у месяц чысціць і мыць усіх кароў і свіней.

Абавязваемся ў гэтым годзе прадаць акружаючым калгасам і калгаснікам не менш 80 парасят і сваімі вытворнікамі злучыць не менш 40 кабыл, 120 кароў і 140 свінаматак.

ВЫКЛІКАЕМ УСІХ КАЛГАСНІКАЎ НА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ЗА ЛЕПШУЮ ФЕРМУ, ЛЕПШЫ ХЛЕЎ, ЛЕПШЫ ДОГЛЯД, ЗА ЗАХАВАННЕ МАЛАДНЯКА НА ЎСЕ 100 ПРОЦ., ЗА СТВАРЭННЕ МОЦНАЙ КАРМОВАЙ БАЗЫ ДЛЯ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ.

Таварышы калгаснікі і калгаснікі! Урокі Касцюковіцкай справы даказваюць нам неабходнасць узмацнення класавай пільнасці, разгортвання рашучай барацьбы за развіццё жывёлагадоўлі. Пастанова ЦК КП(б)Б павінна выклікаць магутны рост новых ударнікаў жывёлагадоўлі, магутны паход за развіццё социялістычнай жывёлагадоўлі.

Т. Мікуцкі, А. Круглік, Курковіч, Янка, І. Казыр, Трасніцкі, В. Дубяня, Жевадзе, Навіцкі, Страж, І. Дубяня, Рашэтаў, Гулько, Зоцыло, М. П. Покаеў, Б. Альвіч, Івоздзеў, Мірук, Ю. В. Белаблоцкі, А. Мікуцкі, Федзенка, Мірук, Гулько.

ЁСЦЬ ЧАМУ ПАВУЧЫЦЦА

ГОРКІ. (Кар. «Звязды»).

На злёце ўдарнікаў соўгаса № 56 цялятніцы **Карнаухава** і **Слесарава** абавязаліся ў 1934 г. не дапусціць адыходу маладняка. Гэту думку падтрымалі зоатэхнік Ураў і брыгадзір соўгаса **Рацькоў.**

Самаабавязацельствы работнікаў МТФ ажыццяўляюцца на справе. Калі ў 1932 годзе адыход складаў 30 проц. у 1933 г. —20, то ў бягучым годзе пасля 32 ацёлаў не было ніводнага выпадку адыходу.

Гэты паказальнік не выпадковы. Ён — рэзультат добрай арганізацыі догляду за цялятамі. Нашым калгасам ёсць чаму павучыцца ў цялятніку соўгаса № 56.

Зойдзем у гэты цялятнік. Перш за ўсё кідаецца ў вочы чыстата, мора святла, сухое, злёгку цёплае паветра. Дыхаць тут лёгка, як у добрым жыллёвым пакоі.

У кутку — радзільнае аддзяленне. Сюды за дзён дзесяць да ацёлу прыводзяць карову, прычым — толькі здаровую. У першы-ж дзень пасля ацёлу цялё за біраецца ад маткі і ставіцца ў маленькае адзіночнае стойла. І толькі ў 2-3-месячным узросце цяляты ставяцца па 3-4, ужо ў большых стойлах.

Вось яны, цыбатыя забаўнікі. Пераліваецца лоскам гладкая шэрсць, свежыя вільготныя мордачкі, вясёлыя вочы. Ва ўсім адзнака здароўя, добрага адчування.

Такі выгляд маладняка, дасягнут перш за ўсё правільным доглядам і кармленнем. Кожнае цялё павінна выпіць 150 літраў цельнага малака і 450 — адгону. Парадак такі: у першы дзень жыцця цяляці даюць 3 літры цельнага малака. На другі дзень норма павялічваецца да 3,5, даходзячы у 15-ты дзень да 6,5 літраў. На 16-ты дзень пачынаюць даваць адгон і таму норма цельнага малака зноў паступова зніжаецца. На 40-вы дзень яно зусім не даецца. А тым часам расце норма адгону да 7,5 літраў у 38-мы дзень, пасля чаго пачынае зніжацца. На 120-ты дзень малако больш не даецца.

З 17-га дня цялятам пачынаюць даваць аўсяную або ячменную муку: першы дзень — 50 грам, а на 120-ты 1,5 кгр.. З 21-га дня цяляты прывучаюцца да сена.

Малако павінна быць нагрэта да 37 градусаў, муку трэба даваць толькі ў сухім выглядзе, а сена лепш за ўсё канюшыннае або лугавое і абавязкова дробнае.

Добрае становішча маладняка тлумачыцца не столькі пармаванням кармоў і распарадкам дня, колькі адданай работай тых, хто выконвае гэтыя нармаванні і распарадкі. Калі-б Карнаухава або Слесарава, працуючы трэці год на цялятніку, не любілі-б сваіх гадаванцаў, не змагаліся-б за якасць кожнага каліва сена, за кожную жменьку асыпкі, калі-б у цялятніку была абязлічка, калі-б зоатэхнік Ураў сядзеў у канторы, а не ў цялятніку, — тады-б не памаглі ніякія нармаванні.

— Вы кажаце: цяляты добрыя, — гаворыць Карнаухава, — яны ў мяне не такія былі-б, калі-б мне выдавалі тыя кармы, што вызначаны па нормах. Скажам — муку цяляты мала калі бачаць у вочы...

Кіраўніцтва соўгаса не забяспечыла цялятнік дастатковай колькасцю кармоў. Але правільна скарыстоўваючы наяўныя магчымасці, ударніцы цялятніка з поспехам выхоўваюць здаровы маладняк.

В. ДАЛЬ.

ПЛЕМЯННОЕ ТОНКАРУННАЕ АЎЦАВОДСТВА—У КАЛГАСЫ

Фота Мартынава (СФ)



Калгас «Красная прэсня» (Сярэдняя Волга) мае добра пастаўленую дробную жывёлагадоўлю. Калгас набыў нядаўна племянных тонкарунных бараноў «Прэкос» у аўцаводчым соўгасе.

На здымку: група племянных бараноў «Прэкос».

План жывёлагадоўлі № 720

Вас цікавіць, як **Сіроцінскі** раён кіруе справай жывёлагадоўлі ў калгасах? Калі ласка, зірніце ў план калгаса **«Маяк социялізма»**, атрыманы з райза па пошце 8 лютага 1934 года за № 720.

Маленькая даведка. Кароў дарослых у калгасе (апрача жывёлы калгаснікаў) — 47, цельных — 36, цялілася з іх 17, усяго пагалоўя буйнай рагатай жывёлы — 68 шт.

Райза ў плане на 1934 год прапануе:

«На 1 студзеня 1935 г. калгас павінен мець абагуленае стада: кароў — 3, цялят — 16, ад 1 да 2 год — 2, пецеляй да 3 год — 0, быкоў вытворнікаў — 1, а ўсяго пагалоўя буйнай рагатай жывёлы —22». З гэтай колькасці прадугледжана планам абагуліць у калгаснікаў 14 цялят.

Ясна? Не? Загадчык МТФ калгаса т. Асташонак таксама гаворыць:

— Нічога не разумею ў плане...

Або вось план гадоўлі авечак. У калгасе цяпер 17 старых авечак і 16 ягнят. А райза прапануе:

«На 1 студзеня 1935 года мець: дарослых авечак — 11, ягнят — 4, прыплоду атрымаць на 1934 год —18 штук ягнят ...»

Зноў арыентыроўка на памяшканне пагалоўя: Можа гэта апіска, не ў тую графу занесены лічбы? Не.

Вось лаічны працяг—план злучнай кампаніі: пакрыць кароў і пецеляй — 3, свінаматак — 1, кабыл — 6 (усяго ў калгасе 27 кабыл, сярод іх жаробных 10 шт.), пакрыць аўцматак—13.

І пад гэтым «перлам» габінетнай творчасці два подпісы:

Загадчык райза **Самусевіч**, зоатэхнік **Іванова.**

А вось і вынікі. У калгасе «Маяк социялізма» цялят радзіла ся 17, а гадуецца толькі 10 — астатнія парэзаны. Загадчык МТФ Асташонак заяўляе: «План гадоўлі 16 цялят выканаем, яшчэ ацеляцца»... Калгаснікі таксама рэжуць сваіх цялят.

Кармы разбазараны, бо выдавалися без нормы . Сена — у гнаі, а вясной пачалі кароў карміць жытняй саломай.

Догляд абязлічан. Пануе ўраўні лаўка. Тры скотнікі атрымліваюць па працадню. Даяркам наліча юцца працадні не ад літра малака, а за 13 галоў — 1 працадзень. Пойшчыцам цялят за 16 цялят — працадзень. Якасць работы не ўлічваецца. А ў выніку, ні колькасць, ні прадукцыйнасць стада жывёлы не расце.

Аўтароў і выканаўцаў кулацкага плана жывёлагадоўлі за № 720 трэба прыцягнуць да судовай адказнасці!

Брыгада «Звязды»: **А. МІКУЦКІ, КАЛТУНОЎ.**

СВІНАРКІ-ЎДАРНІЦЫ

Фота А. Мікуцкага

Лепшыя свінаркі калгаса «Адказ ворагам» (Лёзненскі раён) МАРЗАВА і СТРУКАВА з трохдзённымі парасятамі. Парасяты добрай пароды і ўсе 7 штук ад аднаго прыплоду захаваны для гадоўлі.

КАСЦЮКОВІЦКІЯ СПРАВЫ Ў ВЕТКАЎСКІМ РАЁНЕ

Веткаўскія раённыя арганізацыі яшчэ да сённяшняга дня не зрабілі, для сябе патрэбных вываздаў, вы цякаючых з прамовы тав. Сталіна на XVII з'ездзе ВКП(б) аб жывёлагадоўлі.

Становішча жывёлагадоўлі ў раёне пагражаючае. За апошнія два гады колькасць буйнай рагатай жывёлы зменшылася на 4.775 галоў, або на 22,1 проц. Колькасць свіней скарацілася на 41 проц., а свінаматак на 45,6 проц. Яшчэ большае скарачэнне колькасці авечак, якіх у раёне засталося толькі 19,4 проц. таго, што было ў 1931 г. Асабліва рэзкае скарачэнне па аднаасобнаму сектару. Колькасць коняй зменшылася на 34,3 проц.; буйнай рагатай жывёлы на 34 проц., свіней на 54,4 проц., авечак на 83,4 проц.

У чым прычыны такога рэзкага скарачэння стада ў Веткаўскім раёне?

Партыйна-комсамольская арганізацыя, сельсоветы і калгасы на працягу апошніх двух-трох год пытаннем жывёлагадоўлі амаль зусім не займаліся, даўшы тым самым магчымасць кулацкім элементам беспакарана знішчаць пагалоўе.

Возьмем калгас **«Пераможац»**, у якім ёсць ферма з 200 кароў. Кароўнік у калгасе не ацеплен. Дах у кароўніку адкрыты. Усю зіму жывёла стаяла пад снегам. Кормяць кароў адной саломай, нават рэзку і тую не робяць. Старшы жывёлавод—п'яніца, гультай, фактычна не працуе. У выніку—на ферме абязлічка, няма здельшчыны, работнікі часта мяняюцца. Большасць кароў на ферме назвяргалі.

Калгас **«Ударнік»**, Сівенскага сельсовета. Калгасу не хапае сена, а на стайні сена ўтоптваецца конямі. Стайні не ацеплены. Праўленне калгаса раскрадвае кармы, выкананыя для жывёлы. Раскрадзена 10 цэнтн. бульбы, 48 пуд. аўса.

У калгасе **«Рудня»**, Стаўбунскага сельсовета, на ферме працуюць дзеці. На пытанне — чаму вы ставіце малых даглядаць кароў, загадчык фермы адказвае:

— Дарослых за дрэнную работу будуць караць, а дзяцей судзіць не будуць і яны за сваю работу не адказваюць.

У цэлым радзе калгасаў бываюць выпадкі прапажы цялят, кароў («Вясёлы шлях», «Новыя Грамыкі»). Праўленні калгасаў нават не турбуюцца знайсці прапаўшую жывёлу.

Гэтыя факты па некаторых калгасах з'яўляюцца характэрнымі для ўсіх астатніх калгасаў раёна. Пінкай партыйна-масавай работы вакол развіцця жывёлагадоўлі не вялося. Наадварот у радзе сельсветаў замест масавай работы шырока прымяняліся метады голага адміністравання, якія мала спрыялі разгортванню жывёлагадоўлі. Вось ужо месяц, як на дварэ Барталамеёўскага сельсовета стаяць 4 каровы, забраныя ад сялян за нявывазку лесу. У Нова-Грышацкім сельсавеце забрана 9 кароў, 2 свінні і 4 авечкі.

Характэрны прыклад адміністравання. У Закружскім сельсавеце на сцяне вісіць плакат з планам, што трэба зрабіць для ажыццяўлення пастаноў XVII з'езда ВКП(б). У плане ёсць 13 пунктаў. План заканчваецца наступным пярэджаннем:

«Усе вінаватыя за невыкананне даных указанняў будуць прыцягвацца да суровай адказнасці. Члены і кандыдаты КП(б)Б будуць выключаны з партыі, а беспартыйныя будуць аддаены пад суд». Падпісалі: сакратар ячэйкі КП(б)Б — Башкевіч, старшыня сельсавета— Тагаленка.

Такімі метадамі жывёлагадоўлю ў раёне не паставіш. Адзінымі пагрозамі судовых рэпрэсій выканаць план камплектавання пагалоўя ў раёне наўрад ці ўдасца.

Значны ўплыў на змяншэнне пагалоўя раёна мела няправільнае планаванне размяшчэння жывёлагадоўчых ферм. 40 проц. калгасаў маюць такую спецыялізацыю, якая ні ў якай меры не адпавядае развіццю ферм. Шмат выпадкаў, калі ў калгасах з добрай глебай і высокай ураджайнасцю пры нізкай колькасці лугоў і выпасаў арганізуюцца буйныя малочна-таварныя фермы. У той-жа самы час у калгасах з добрымі лугамі і выпасамі, пры бесструктурнай глебе і нізкай ураджайнасці насаджаюцца свінагадоўчыя фермы. Такое планаванне прывяло к таму, што рад свінатаварных ферм прышлося перакідваць з калгаса ў калгас. Так, напрыклад, з калгаса «Праўда» прышлося перакінуць 39 свіней, «Будаўнік социялізма»—76, «Палац рэволюцыі»—64, «Багатыр»—44 і т. д.

Найбольш спрыяючымі для развіцця свінагадоўлі з'яўляецца Стаўбунскі, Радушскі, Сівенскі, Дзвілаўскі і іншыя сельсоветы раёна. У гэтых сельсоветах ёсць усе ўмовы для арганізацыі свінатаварных ферм. Але ў выніку шкодніцкага планавання ў гэтых калгасах усяго толькі некалькі свінаферм.

Амаль ва ўсіх свінагадоўчых фермах няма правільнай арганізацыі працы, усюды пануе абязлічка і функцыяналка. Адзін дзень корміць адзін, заўтра другі, а фактычна ніхто за жывёлу не адказвае.

Адной з рашаючых умоў для аднаўлення стада з'яўляецца правільнае правядзенне злучной кампаніі. Аднак, гэту справу раён недацаніў. За 1933 г. план злучкі коняй выканан па калгасным сектару на 66 проц., па аднаасобнаму —5,34 проц. Яшчэ горшай справа з захаваннем маладняка і прыплодам. У калгасе «Ударнік» за мінулы год ні адна матка не дала прыплоду, у калгасе «Перадавік» з 16 матак далі прыплод толькі дзве. І так у астатніх калгасах раёна. У калгасе «Пераможац» з 62 кароў летась ацялілася толькі 18; у калгасе «Партызан» з 21 каровы далі прыплод толькі 10.

Здавалася-б, што гэтыя лічбы павінны былі сігналізаваць раённым арганізацыям на неабходнасць арганізаваць гэту справу з самага пачатку новага года. Аднак, і зараз у раёне ніхто гэтай справай не займаецца. Нічога таксама не робіцца для арганізацыі ветэрынарнай дапамогі калгасам, хоць у раёне ёсць даволі многа ветэрынараў.

Веткаўская партыйная арганізацыя павінна ўлічыць пагражаючае становішча з жывёлагадоўляй, якое стварылася ў раёне. Улічыўшы сігналы Касцюковіцкага раёна і шастаповy ЦК КП(б)Б па гэтаму пытанню, Веткаўская раённая арганізацыя павінна практычнай работай дабіцца таго, каб ажыццявіць указанні т. Сталіна, што 1934 год стаць годам пералому ва ўсёй жывёлагадоўчай гаспадарцы.

Ф. ДЗІМІТРЫЕЎ. Я. ВАЙНШТЭЙН.

А. СТАХОВІЧ

Памочнік начальніка палітаддзела соўгаса „Горкі-Апчак"

Брыгадзірша

У канцы марозных, абвеяных пустым снегам студзеньскіх дзён, пад скрып кляновых палазоў вазка, на шырокі двор соўгаса «Горкі Апчак» уз'ехаў малады хлапчук.

Прывязаўшы сваю гнядую кабылу да перакладзін, ён адпусціў перасядзельнік, падкінуў сухой, зялёнай цімафееўкі, абтрос запарошаны снегам кулдаты авечы кажух і, пастукваючы падмёрзлымі абсацамі, накіраваўся ў клуб.

У калідоры хлапчук сустрэўся з белакурай дзяўчынай. Ціхім, хрыпватым ад марозу голасам, ён спытаў яе:

— Свежанькія. Толькі што з Менска... А цікавыя-ж сёння... Яны зайшлі ў чытальню. Хлапчук зняў сумку, прымасціўся ля стала і пачаў выцягваць газеты.

— А вось і «Комсамолка» твая, прагаварыў хлапчук, працягваючы да дзяўчыны свежы нумар газеты.

Еўка пачала прагавіта чытаць «Комсамолку», якая вабіла вялікімі літарамі: «Даклад тав. Сталіна».

Хутка клуб пачаў напаўняцца людзьмі. Начальнік палітаддзела з газеткай прысеў ля стала. Падсунуўшы бліжэй лампу, ён расшпіліў кажух і ў голас пачаў чытаць даклад тав. Сталіна.

Еўка сядзела на лаўцы сярод свінароў. Кожнае новае слова даклада хвалявала яе. З кожным словам даклада яе ўсё больш пранізвала думка — як на сваім невялічкім участку, у сваёй брыгадзе выканаць заданне правадыра — зрабіць гэты год годам далейшага пералому да ўздыму ва ўсёй жывёлагадоўчай гаспадарцы.

Прыйшоўшы да-дому яна доўга не магла заснуць.

Узнікалі думкі, нараджаліся планы, — як захаваць кожнае парасё, зрабіць брыгаду ўзорам для ўсяго соўгаса.

* * *

Доўгі час Еўка працавала свінаркай.

А ў снежні, у скрыпучыя маразы, калі першы матачны камбінат апынуўся ў глыбокім прарыве, Еўку паслалі туды брыгадзіршай.

У той дзень, ужо пажылы Ахрэм сустрэў дырэктара на ферме і пакручваючы свой кароткі, рыжаваты вус, ціха шапнуў на вуха:

— Прашыблі, таварыш дырэктар. Ці-ж гэта шчупленькая маленькая дзяўчына справіцца з камбінатам? Тут добрыя дзядзькі па пяць галоў варочаюць і то ўвесь час цягаюць паўшых парасят і свіней з свінарніка ў салатопку... Куды-ж ёй...

І пайшлі бурлівыя будзённыя дні. Пакідаўшыя спачатку невялічкія, а потым усё большыя і большыя сляды працы маладой брыгадзіршы.

— Самае галоўнае — вывучаць, ведаць людзей, што працуюць у брыгадзе, сказала сабе Еўка з першых дзён сваёй работы брыгадзіршай.

Яна добра ўсвядоміла, што ўсё залежыць ад людзей, ад таго, як кожная свінарка паасобку будзе працаваць у брыгадзе.

І не толькі гэта. Занязаўшы касынкай свае мяккія, ільняныя валасы, закасаўшы рукавы, яна кожны дзень станок за станком абыходзіла свінарнік, чысціла іх, наводзіла парадак, карміла, паіла і вывучала асаблівасці паасобных свіней.

Сваёй работай яна захапляла работніц. Заветная думка Еўкі — зрабіць брыгаду ўзорнай — зрабілася думкай усёй брыгады.

Вальковіч Арына, якая раней ні бы мокрая квакуха ледзь капашылася ля карыт і ўсё пазірала ў невялічкае вакенца ці скора дзень мінецца, трапіўшы ў брыгаду зусім змянілася.

— Не пазнаць Арыну, — кажуць рабочыя. — Ды ці толькі Арыну?

— У нас у брыгадзе такі цяпер парадак, што проста люба працаваць. Працуеш і здаецца ўжо добра. А ўсё-ж хочацца, каб лепш і лепш працаваць, — гаворыць маладая, румяная Вера.

Ахрэм дзівіўся. Калі, бывала, сустракаў на ферме дырэктара, ён, чухаючы сваю ўжо сіваватую патыліцу адыходзіў у бок.

Аднойчы, калі занядужаўшая свінаматка штосці не са смакам смактала жыжку з карыта, Еўка прывяла ветурача. Ахрэм стаяў ля дзвярэй, глядзеў на яго і ад душы смяяўся.

—Да душы-ж, век не бачыў, каб ветурачы над хвастом у свіні вымяралі градусы...

Але новыя парадкі на камбінаце выклікалі не толькі смех старога Ахрэма. Часта свідравала яго думка: «а можа так і трэба... і добра, што так робяць маладыя»?

Хочацца старому Ахрэму стаць маладым, жыць і жыць... Хочацца вярнуць свае маладыя гады, што прайшлі не за пюх табакі.

Глядзіць Ахрэм і ніяк не надзівіцца з работы маладой дзяўчынкі.

У тыя дні, калі на дварэ яшчэ стаялі халады, калі спорадзёны марозны вецер абдаваў тонкія сценкі пранізістых, доўгіх свінарнікаў, пачаліся масавыя апаросы.

Тады яшчэ часцей і мацней пачало біцца маладое сэрца брыгадзіршы. Яна добра ведала, што захаваць маладняк ды яшчэ ў такую пару — справа нялёгкая.

— Прападзеш, запышэшся, дзеўка, не на свой сучок ты, птушачка, села, — гаварылі некаторыя мужчыны з суседніх камбінатаў.

У доўгім калідоры свінарніка, ля невялічкага станка, дзе цяжка пых цела цяжарная віславухая матка — свінаркі абступілі брыгадзіршу.

Еўка ўстрахвала валасамі, папраўляла невялічкія ільняныя пасемцы, што спаўзалі на румяныя шчокі, і гаварыла свінаркам:

— У нас, можна сказаць, цяпер уборачная... Працаваць трэба з большай стараннасцю, каб заняць першае месца. А мы гэтага дабіемся. Толькі трэба берагчы кожнае парасё так, як добрая мат ка беражэ сваё роднае дзіцяё.

Бывалі дні і ночы, калі Еўка не выходзіла з свінарніка. Пры цмяным закапцелым свеце ліхтара сядзела яна ля станка над цяжка пыхцеўшай маткай, што з патугамі выціскала сваіх маленькіх, ружовенькіх парасятак.

Выціраючы мяккай анучкай кволых, з доўгімі, яшчэ не абсохшымі пупкамі, парасят, — яна асцярожна складала іх у спецыяльную апаросную скрынку і праз кожную гадзіну падсажвала іх да маткі.

— Вось гэта парасё да восені не менш, як цэнтнер будзе, — любавалася Еўка.

—,Сюды, сюды, хутчэй, — клі ча дзяжурная свінарка — у курносай пачаліся ўжо патугі... І так праз усю пару Еўка посіцца ад адной паросной маткі да другой, дзе свінаркі чакаюць яе дапамогі.

Увечары, ідучы на зоатэхнічныя заняткі, Еўка абышла станкі і, за чыняючы дзверы, яшчэ раз папярэдзіла Мар'ю:

— Ты-ж глядзі, Мар'я, за малышамі, каб не ўспёрлася на іх ла павухая... За сваімі доўгімі, шырокімі, як той прысядзібны лапух, вушамі, яна нават і свету не бачыць...»

Так працавала брыгада Матусевіч Еўкі.

З самай адсталай, якая цягнула назад усю ферму і запаўняла сваім пагалоўем усе станкі ізалятара, брыгада выйшла цяпер у перадавы, заняла самае пачэснае месца ў соўгасе.

Прасторныя станкі, размешчаныя абапал доўгага калідора, напаўняюцца беласнежнымі сасупкамі. Ужо ў першыя два месяцы новага года ў камбінаце нарадзілася сто семдзесят пяць парасят. Не гледзячы на халады, на туманныя вільготныя веснавыя дні ў брыгадзе няма ніводнага адыходу.

Пагалоўе камбіната расце. Яно пераваліла за дзве з палавінаю сотні. Кожны дзень мяняюцца лічбы ў невялічкім блакноціку брыгадзіршы. Расце пагалоўе, а разам з пагалоўем расце загартаванасць пера давой у соўгасе брыгады.

І цяпер, калі сонца падымаецца ўгару, калі з шырокіх палёў бурчаць каламутныя раўчыкі, ля дзвярэй адкормачніка радасна гудзіць ятор спыніўшагася аўтамабіля. Машына нагружаецца высокаякаснымі бэконам для адпраўкі на Аршанскі мясны камбінат. Прыёмшчык Бекер моцна паціскае руку брыгадзіршы, адзначаючы яе плённую і самаадданую работу.

— Гэта што, — гучна адказвае Еўка. — Другім разам адгрузім больш.

І яна, зноў закасаўшы рукавы, пачынае замешваць корм і разліваць яго ў карыты.

„РАЗГОРТВАННЕ СОВЕЦКАГА ГАНДЛЮ З'ЯУЛЯЕЦЦА ТОЙ АКТУАЛЬНЕЙШАЙ ЗАДАЧАЙ, БЕЗ ВЫРАШЭННЯ ЯКОЙ НЕМАГЧЫМА ДАЛЕЙ РУХАЦЦА ЎПЕРАД" (СТАЛІН)

„ТАВАРАЗАТРЫМЛІВАЮЧЫ" ПУНКТ

БАБРУЙСК. (Кар. «Звязды»).

На складах Бабруйскай міжраён ной базы Белкаапсаюза ляжаць розныя тавары па 403.000 руб.

— Нічога страшнага, гэта пазы лімітныя астачы, спакойна заяўляе дырэктар базы т. **РАСКІН.** Сярод «лімітных астач» ёсць такія тавары, як мануфактура, запалкі, гаспадарчае мыла.

А ў краях Бабруйска, Глуска, Парыч і іншых раённых цэнтраў гэтых тавараў не знойдзеш. Яны загрузлі на базе, з'яўляючыся маўклівымі сведкамі пяўмення гандляваць.

Як кажуць, кожная палка мае канцы. Сабатаж совецкага гандлю б'е па спажыўцу і ў той-жа час моцна б'е па фінансаваму становішчу базы.

Бала пратэрмінавала банку 400.000 руб., дайшла да таго, што банк налажыў арышт на тавары і вазначыў распродажу. Пасля некалькіх званкоў і настойлівых просьб базы дырэктар банка т. Шульман адклаў распродажу.

Бабруйская база і ўсе 6 райсаюзаў, звязаных з ёю заняты цяпер перагаворамі з банкам, ім няма часу займацца спажыўцом.

Вывучэнне попыту і ўмелае яго задавальненне адна з асноўных умоў правільнай арганізацыі совецкага гандля і ліквідацыі затаварвання. Бабруйская база Белкаапсаюза прабавала заняцца вывучэннем попыта спажыўца. Гандлёвы інспектар **РОЖАЎСКІ** пабываў у раёнах і прывёз некалькі заявак на патрэбны для сельпо тавар. Напрыклад, Ліпенскае сельпо, Асіпавіцкага раёна патрабуе мануфактуры, кандзітэрскіх вырабаў, газы, чыгуноў, мыла, запалак, мэблі, соды і інш.

— Ці ўлічылі вы пры дачы заявак на завод тавараў патрабаванні Ліпенскага сельпо?—пытаемся мы ў дырэктара базы Раскіна.

— Улічылі, але таго, што яны просяць не адпусцілі — адказвае Раскін.

— Чаму?

— Ну, падумайце самі, мануфактура,—тавар планавы?—і ён загнуў палец.—А мыла адгружаецца па плану?—загнуў ён другі палец. А запалкі?..

У Раскіна не хапіла пальцаў для пералічэння «планавых» тавараў. Ён патрос кулакамі:

— Ну, як-жа мы можам самі даць ім планавы тавар.

Так скончылася спроба вывучыць попыт спажыўца. Аб самазакупках т. Раскін не гаварыў. Іх няма ў планах базы.

Пры размеркаванні тавараў па райсаюзах база кіруецца каэфіцыентамі. Каэфіцыент Бабруйска — 18,2, Глуска—13,3, Парыч—10,5, Асіпавіч—8,8, Жлобіна—19,9, Рагачова—29,3. Разам—100.

Вось напрыклад, атрымана партыя мануфактуры на 32.120 руб. На аснове каэфіцыента Бабруйск атрымлівае тавар на 5.920 руб., Глуск — на 4.200, Парычы — на 3.400, Асіпавічы—на 2.900 руб. і т. д.

Праўда, Бабруйску гэта мануфактура не патрэбна, яна ёсць ва многіх магазінах. Праўда, Асіпавічы і Парычы могуць задаволіць попыт на мануфактуру толькі на 50 проц. Але што базе да гэтага! У яе ёсць каэфіцыенты, у яе ёсць паперка, хоць лічбы яе доўно ўстарэлі.

Пры цяперашнім становішчы Бабруйская база не апраўдвае свайго назначэння. Яна не з'яўляецца адным з асноўных звеньняў тавараразводзячай сеткі, яна хутчэй «таваразатрымліваючы» пералачны пункт, лішняя інстанцыя на шляху тавара ад прадпрыемства да спажыўца.

Возьмем тую-ж партыю мануфактуры. Яна па чыгунцы ішла да Бабруйска. Тут яе разгрузілі на складзе базы. Пакуль яе разгледзелі, склалі разнарадку для раёнаў—прайшло 10 дзён, пакуль пагрузілі і адправілі — яшчэ 10 дзён. Для чаго патрэбны гэты 20 дзённы «адпачынак» для дэфіцытнага промтавара!

На міжраённыя базы ўскладзены вельмі важныя адказныя задачы. Яны павінны быць арганізатарамі совецкага гандлю ў нізоўцы, на аснове ўсебаковага вывучэння попыту насельніцтва канкрэтна кіраваць гандлёвай работай, усямерна задавальняць патрэбанні нізавой сеткі. А для гэтага базы павінны перабудаваць сваю работу, пакончыць з даўно асуджанымі метадамі механічнага размеркавання тавараў. Гэта павінна зрабіць і Бабруйская міжраённая база.

П. ЧЫКУН.

ДЛЯ СПАЖЫЎЦА ЦІ ДЛЯ ЗВАЛКІ?

Менхарчгандаль—новая, нядаўна створаная арганізацыя. Яго задача—разгарнуць культурны совецкі гандаль харчовымі прадуктамі. Як Менхарчгандаль спраўляецца з даручанай яму работай?

Падамо некаторыя факты.

Дырэктар Менхарчгандля тав. Герчыкаў цвёрда запомніў дырэктыву: не спадзявайся выключна на цэнтралізаваныя фонды, праяўляй ініцыятыву, разгортвай самазагатоўкі. Яго ўпаўнаважаныя і агенты раз'язджаюць па гарадах і вёсках. Але што робяць гэтыя агенты, якую прадукцыю купляюць яны, як адгружаюць яе—гэта Герчыкава не цікавіць.

Нядаўна нам. дырэктара тав. Шэндаровіч закупіў 10 тон марынаваных грыбоў, заплаціўшы за іх 17 тыс. рублёў. Пусцілі грыбы ў продаж па 2 руб. 30 кап. кіло. Ніхто не купляў. Выгляд нешта жахлівы і пах непрыемны. Праз тыдзень-два праўленне знізіла цану да 1 руб. 75 кап. Але і тады іх ніхто не браў. А праз некалькі дзён санітарная інспекцыя склала акт: грыбы зусім непрыгодны да спажывання.

Загадчыкі магазінамі здалі дзесяткі бочак забракаваных грыбоў на гароднюю базу Менхарчгандля—нехай яна выкідвае іх на звалку.

А база (загадчык тав. Бакун), выконваючы распаражэнне дырэкцыі, пасадзіла людзей для пераборкі, каб пусціць іх зноў у продаж. Менхарчгандаль, не зважаючы ні на што, імкнецца, каб спажывец расплачваўся за яго галавацяпства.

Нядаўна ў Чэрвені закупілі 60 тон квашанай капусты. Прывезлі яе ў Менск у адкрытых, брудных бочках. Капуста была зусім сухая, без расолу. Яна ўся аказалася папсаванай і яе прышлося выкінуць на звалку. Цяпер бочкі з гэтай капустай «упрыгожваюць» двор гароднай базы Менхарчгандля на Комсамольскай вуліцы.

Варта пабываць на гэтай базе, каб на кожным кроку ўбачыць сляды злачыннай безгаспадарчасці. Ба за змяшчаецца ў вільготным брудным сутарэнні, дзе ў грязі і вадзе навалены бочкі з грыбамі, скрыні з кавы і т. д. Нядаўна ў грязі ва ялася некалькі тон бульбы. 16 чалавек перабіралі яе, а потым, палову прышлося выкінуць; Менхарчгандаль страціў з-за гэтых агіднасцяй дзесяткі тысяч рублёў.

«Звязда» ўжо пісала аб «вайне» двух загадчыкаў былога магазіна № 1 Белгандля. Два месяцы ішла перапалка — каму павінен належаць магазін: Менхарчгандлю або Менгандлю. Два месяцы загадчыкі, назначаныя абодвымі арганізацыямі, абменьваліся грознымі ўльтыматумамі. Цяпер пытанне як быццам вырашана: над дзвярамі з'явілася шыльда: «Магазін Менхарчгандля № 29». Але на справе ўсё засталося паранейшаму — сядзяць у адной канторцы два загадчыкі і ваўкамі пазіраюць адзін на другога. А склад у іх агульны: ніхто за яго не адказвае. Абодвы загадчыкі **Мудрачэнка** і **Пагарэльцаў** знімаюць з сябе ўсякую адказнасць. А абязлічка і безадказнасць—верныя спадарожніві растрат і расхрадвацяў.

А вось метады гандля, ад якіх за версту нясе спекулянцка-нэпманскім душком.

8 сакавіка паступілі ў крамы Менхарчгандля мясныя кансервы. На прыгожых вялікіх банках з'явіліся эцікеткі: **9 руб. 40 кап.** Праз некалькі дзён наклеілі новыя: **5 руб.** У чым справа? Аказваецца, цана кансерваў—5 руб., але нам. дырэктара Менхарчгандля т. **Шэндаровіч** хацеў на гэтым спекульнуць і павысіў расцэнкі да 9 руб. 40 кап. Толькі тады, калі дырэкцыя ўбачыла, што кансервы ніхто не купляе, яна ўстанавіла нармальную цану.

Свавольным павышэннем цэн Менхарчгандаль імкнецца прыкрыць плады безгаспадарчасці.

АЛЕСЬ.

„ГАЛОЎНАЯ АДЗНАКА ПАРТЫЙНАСЦІ БОЛЬШЭВІКА— РОЛЯ АВАНГАРДНАГА БАЙЦА ЗА СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ АДНОСІНЫ ДА ПРАЦЫ, РОЛЯ АРГАНІЗАТА А СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПОСАБУ ВЫТВОРЧАСЦІ Ў ПРАМЫСЛОВАСЦІ І СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ" (КАГАНОВІЧ)

НІЗАВЫЯ ПАРТЗВЕННІ НЕ ПРАЦУЮЦЬ

(АД КАРЭСПАНДЭНТА «ЗВЯЗДЫ» ПА ГОМЕЛЬСКАМУ ЧЫГУНАЧНАМУ РАЁНУ).

Тав. **Каганові́ч** у сваім дакладзе на XVII з'ездзе ВКП(б) звярнуў сур'ёзную ўвагу на ўмацаванне нізавога партыйнага звяна. Партгрупы не павінны капіраваць цэхавую арганізацыю. Яны павінны быць групамі баявога дзеяння, якія менш за ўсё займаюцца загадамі і пісаннем рэзалюцый.

Трэба сказаць, што партарганізацыя гомельскага чыгуначнага раёна не ўлічыла ўказання тав. Кагановіча, не перабудавала работу сваіх нізавых звеньняў.

Царторгі паравознага дэпо **Жарын** (старае дэпо) і **Вальчэўскі** (ступеньчатае дэпо) усю работу зводзяць да нарад, на якіх абгаварваюць літаральна ўсе пытанні, прычым практычных рэзультатаў ад гэтых нарад няма. Партгрупорг **Хімакоў** проста заявіў, што ён комуністаў асобна не склікае, а мае справу з усёй брыгадай. Тут у наяўнасці прамая падмена проф групорга і брыгадзіра. Унутры партыйнай работы няма і ў паміне.

Паравозныя партгрупы таксама бяздзейнічаюць. Партгрупорг **Тарэлкін** скардзіцца на слабую дысцыпліну. А хто вінават? Перш за ўсё сам т. Тарэлкін, які не здолеў наладзіць масавую работу.

Не лепш і ў вагонным дэпо. На запытанне ў групарторга цэха сярэдняга рамонту т. **Раманькова**, якую ён вядзе работу, той адказаў:

— Ніякай, дый наогул навошта тут групарторг, калі ёсць брыгадзір.

І сапраўды, Раманькоў нічога не робіць.

Сакратар парткалектыва **Гусеў** вельмі многа гаворыць аб перабудове партработы, але практычна нічога не зрабіў.

Такое-ж становішча і ў партарганізацыі эксплаатацыі. Значэнне партгруп яўна недаацэньваецца. Партгрупорг грузчыкаў т. **Радзько**, напрыклад, прама аб гэтым гаворыць:

— Са студзеня ніхто не кіруе нашай работай, не інструктуе, не ўказвае, не дапамагае. Калі якая небудзь работа вядзецца, то выключна ў парадку самацёку. Праверкі нашай работы няма.

Сакратар парткалектыва **Стэльмакоў** не бывае ў групах, не цікавіцца іх работай.

У даны момант пачалася перабудова партарганізацыі на чыгунцы. Трэба ўлічыць недахопы кіраўніцтва нізавымі партзвеннямі. Перабудова павінна дапамагчы партгрупам стаць сапраўднымі арганізатарамі вытворчых перамог на аснове добра пастаўленай партыйна-масавай работы.

ПАПЯРЭЦКІ.

ПАРТЫЙНЫ АРГАНІЗАТАР

Густы крык заводскага гудка пранізаў харастро сакавіцкай раніцы. Салодкаму сну прышоў канец. **Ясюнас** выскачыў з-пад коўдры і падышоў да вакна. Адкрыў фортку. У памяшканне ўварваўся разам з свежым паветрам аглушальны, радасны голас завода. «Таварыш парторг, не пазніся», — загадаў сабе Ясюнас і пачаў хутка збірацца на работу. Сабраў са стала літаратуру аб XVII партз'ездзе, над якой учора позна сядзеў і паклаў на этажэрку. Праверыў блок-нот.

Па дарозе ў цэх Ясюнас перадумаў усё, што адбылося за апошнія два тыдні. Ён перастаў сябе пазнаваць. Куды дзявалася ранейшая вяласць і стома. Ясюнас за два тыдні вывучыў кожнага комуніста, адкрыў у іх новыя якасці, якіх раней не заўважаў, калі працаваў сакратаром парт ячэйкі цэха.

Цэх вышаў з прарываў і перавыконвае план.

Пасля таго як вырваўся з палону парткалектыўскай канцыляры, Ясюнас ўзяўся за арганізацыю партработы ў цэху. Першым пунктам было — дабіцца авангардной ролі комуніста на вытворчасці. У цэху працуе 26 комуністаў. Сіла не малая. Ясюнас на першым сходзе партарганізацыі паставіў пытанне аб перастаноўцы сіл. Самых лепшых кваліфікаваных комуністаў паставіў працаваць на распілоўцы. На чале гэтай групы стаў групарторгам вядомы ізотавец лесакамбіната тав. **Гладышаў.** За адзін тыдзень Гладышаў дабіўся, што ўсе комуністы яго групы сталі працаваць на «выдатна». Яго метад: асабісты прыклад, таварыская дапамога і большэвіцкая дысцыпліна. Гладышаў дабіўся, што ўсе яго комуністы здалі тэхэкзамен на «выдатна». Усе комуністы сталі акуратна наведваць палітшколу. Нават Іваноў, дзэртыр вучобы, зрабіўся адным з лепшых.

Але самае галоўнае — ліквідацыя ўраўнілаўкі. Раней да перабудовы самы адказны работнік, ад якога залежыць работа ўсяго цэха — рамшчык — атрымліваў менш за чорнарабочага. Толькі дзякуючы бліскучай рабоце Гладышава, ні адзін са старых рамшчыкаў не кінуў рамы.

Зараз рамшчык зарабляе не 3-4 рублі, а 6-7 за змену. Намочдікі рупца бяруцца за вывучэнне тэхнікі з намерам стаць рамшчыкамі.

Частку комуністаў прышлося перакінуць на шагаючы транспарцёр, каб ліквідаваць залежы гатовай прадукцыі.

У канцы змены Ясюнас заўсёды сустракаецца з групарторгамі, з комуністамі. Ён тут-жа па месцы задавальняе прэтэнзіі асобных таварышоў. Вырашае спрэчнае пытанне, дае і правярае выкананне партыйных заданняў.

***

Ясюнас спыніўся ля дошкі, на якой вісялі невялічкія бляшаныя нумары рабочых. Усе цвічкі заняты. Ясюнас прытуліўся да сцяны і запісаў у свой блок-нот: «На печнай змене спазненняў і прагулаў не было». Зайшоў у цэх. Работа на поўным ходзе. Прызвычаенае вуха ў агульным шуме ўла віла роўны і правільны подых машын. Ясюнас абышоў усе распілоўчавыя рамы і збіраўся ўжо выхадзіць з цэха, як пачуў воклич:

— Таварыш парторг, — махаў на яго рукой Гладышаў. — Бачыш, што пілы выробляюць? — паказаў Гладышаў рукой на распілаваны канец калоды. — Псуем лес. Пілы новыя патрэбны.

Ясюнас адвярнуў адну дошку і ўбачыў, што Гладышаў кажа праўду. Пілы знасіліся і «блукаюць» па калодзе, псуюць экспартны лес. У яго блок-нот дабавіўся запіс: «Пілы псуюць лесаматэрыял, высветліць прычыну».

Зайшоўшы ў пакой начальніка лесацэха, Ясюнас прысеў ля стала і разгарнуў блок-нот. Тут запісан быў план яго работы на сённешні дзень: «Першае — правераць выкананне задання па сталовай, другое — канферэнцыя па якасці; трэцяе — пілы псуюць матэрыял, высветліць прычыны».

Ясюнас звярнуў увагу па сталоўку з першых-жа дзён сваёй работы ў якасці цэхпарторга. Не сталовая, а нейкая педарэчнасць. Усюды бруд, сталы паламаны. Лаўкі пакалечаны. А галоўнае, што заўсёды выклікала скаргі рабочых — недахват пасуды і лыжак. На 170 рабочых у сталовай толькі 20 талерак, 22 лыжкі і ні адных відэлец. Якасць абедаў нізкая. Дрэнная работа сталоўкі самым шкодным чынам адбівалася на выкананні плана.

Цэхпарторг разам з начальнікам цэха тав. **Вальфсонам** распрацаваў план паляпшэння сталоўкі. Для правядзення гэтай работы Вальфсон вылучыў загадчыка гаспадаркай **Жалабкова**, а Ясюнас па партыйнай лініі даў заданне загадчыку сталовай Куніцэвічу. Тэрмін правядзення работы — чатыры дні.

К вечару таго-ж дня Куніцэвіч дастаў некалькі скрынак пасуды, у тым ліку графіны і стаканы для вады, а таксама поўны камплект лыжак і відэльцаў. Брыгада прыбіральшчыц старанна вычысціла з сталовай бруд. Праз расчыненыя вокны выгналі з памяшкання смурод пракісшай стравы.

На другі дзень Жалабкоў прывёз новыя сталы і крэслы. А на трэці дзень сталовую ўжо не пазнаць.

Паклапаціўся Ясюнас і аб якасці абедаў. Паміж лесацэхам № і і кухняй камбіната заключан дагавор, паводле якога кухня варыць для лесацэха ў асобных катлах палепшаныя абеды за дадатковую плату з сум кіраўніцтва цэха.

Другія цэхі лесакамбіната пачынаюць браць прыклад з лесацэха № 1.

У абедзены перапынак Ясюнас склікаў партыйны «кансіліум» для лячэння «блудлівых» піл. Пры шлі дзяжурны інжынер, механік. Было адразу ўстаноўлена, што ўсяму віною — зношанасць і няправільная расстаноўка піл. Паклікалі піластаву, які тут-жа перамяніў пілы. Пасля абеду рама ўжо не давала браку. Але перад Ясюнасам стала праблема — дастаць новыя пілы, бо інакш рамы неўзабаве выйдуць са строю.

Гудок аб сканчэнні работы першай змены застаў Ясюнаса і Вальфсона ў цэху. Заўтра — выходны для рабочых і рамонтны дзень для абсталявання. Рамшчыкі па чарзе дакладваюць аб заўважаных дэфектах абсталявання, якія заўтра неабходна ліквідаваць. Ясюнас у гэты час таксама правёў пяцімінутны мітынг аб канферэнцыі па якасці, якая сёння адкрываецца на камбінаце. Пасля мітынга выбраныя дэлегаты разам з Ясюнасам адправіліся на канферэнцыю.

Канферэнцыя закончылася ўручэннем пераходнага чырвонага сцяга лепшаму ўчастку лесакамбіната — лесацэху № 1.

АРЦЕЛЬНЫ.

НА ЧАЛЕ МАС

Мы ўвайшлі на калгасны двор. Вялікая роўная пляцоўка, вакол якой размешчаны ўзорна пабудаваныя скотныя хлявы, канюшня, свіран, павеці для інвентара. Пасярод пляцоўкі—студня, якая служыць добрым ваданоем для жывёлы.

Знадворнаму выгляду калгаснага двара адпавядае і стыль работы калгаса. Прысвоіўшы сабе імя большэвіка-арганізатара, тав. Свярдлова, калгас гэту назву поўнасцю апраўдвае.

Калі ў мінулым годзе было 156 гаспадарак, то сёлета—181. План сяўбы яравых—516 га. У калгасе ёсць МТФ на 200 галоў і свінная племянная ферма на 100 галоў.

У мінулым годзе калгас добра спраўіўся з усімі палявымі работамі, поўнасцю разлічыўся з дзяржавай. Калгаснікі атрымалі па 3 кіло зернавых і 5 кіло бульбы на працадзень. Яны не толькі поўнасцю забяспечаны хлебам і іншымі прадуктамі, але маюць і лішкі. Амаль кожны калгаснік прадаў каапераціі 4-5 пудоў збожжа і 2-3 цэнт. бульбы.

Калгас ужо гатоў да сяўбы. Насенне поўнасцю засыпана, адсартавана і ачышчана. Добры адбор і захаванне насеннага фонду далі высокую ўсхожасць—не ніжэй 93 проц.

Плугі, бароны, калёсы, збруя адрамантаваны самімі калгаснікамі ў калгасных майстэрнях і кузнях. Цягавая сіла таксама добра падрыхтавана да вясны. З 138 рабочых коняй толькі 4 старыя не могуць быць выкарыстаны на палявых работах, але для іх ёсць іншая работа.

У калгасе—6 паляводчых брыгад. Усе яны добра ведаюць сваіх людзей, планы сяўбы і ўчасткі, дзе будуць сеяць.

Як дасягнуў калгас такіх поспехаў?

Праўленне на чале з комуністам **Хількевічам** правільна і ўмела кіравала работай. Тав. Хількевіч—адзіны комуніст у калгасе—здолеў арганізаваць вакол сябе комсамольскі і беспартыйны актыў (больш 50 чал.) і забяспечыць партыйнае кіраўніцтва.

— Цяжка адрозніць, дзе пачынаецца мая работа, як старшыні калгаса,—кажа тав. Хількевіч, — і работа партарганізатара. Але я разумею, што без арганізацыі актыва далёка не паедзеш. Таму я задаўся мэтай правільна расставіць людзей і перш за ўсё актыў.

У тав. Хількевіча ёсць чаму па вучыцца другім парторгам. Узяць такі важны ўчастак, як работа нізавога друку. Рэдактарам калгаснай газеты «Штурм» працуе комсамолец **Міронаў**—актыўны селькор не толькі раённай, але і раду цэнтральных газет. «Штурм» нарадзіўся ў канцы 1931 года. У мінулым годзе ён адзначыў юбілей чатырохсотага нумара. Недарма калгаснікі кажуць: «Наш «Штурм», хоць і не мае вачэй і вушэй, бачыць і чуе вельмі далёка». Амаль ні адна заметка «Штурма» не астаецца без рэагавання.

Тав. Хількевіч здолеў прыцягнуць да работы ў калгасе і нас таўнікаў, якія кіруюць гуртком па вывучэнню агратэхнікі і школамі неісьменных і малапісьменных.

Падрыхтоўку да сяўбы тав. Хількевіч цесна ўвязаў з прапрацоўкай пастаноў XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда ВКП(б), асабліва даклада тав. Сталіна. Прапрацоўка даклада тав. Сталіна пачалася на сходзе калгаса. Потым яна разгарнулася па брыгадах, па хатах калгаснікаў. Цяжка знайсці ў калгасе такога калгасніка, які-б не ведаў даклада тав. Сталіна.

Атрымаўшы план веснавой сяўбы, тав. Хількевіч зараз-жа давёў планы да брыгад. Тут-жа на парадзе брыгадзіраў ён высунуў пытанне аб разгортванні спаборніцтва паміж брыгадамі на лепшае правядзенне сяўбы. Брыгады заключылі паміж сабой сацдагавор, у якім абавязаліся правесці сяўбу зерновых на працягу 15 дзён замест 20 наводле плана.

Пры той падрыхтаванасці калгаса да сяўбы і баявым настроі калгаснікаў, з якімі яны сустракаюць вясну, гэта абавязацельства будзе поўнасцю выканана.

Рагачоўскі раён. **ФРАЛОЎ.**

НА ЛЕКЦЫІ ГРАМАДАЗНАЎСТВА

Без грунтоўнай падрыхтоўкі я на лекцыю ніколі не прыходжу, — гаворыць ударніца-настаўніца 23-й Менскай яўрэйскай ФЗС тав. Фурман.

Сапраўды, хто пабываў на лекцыях у т. Фурман у IV групе, той вам пацвердзіць, што ў яе ўніцы-ўдарніцы словы не разыходзяцца са справай.

Да заняткі мы ўважліва праглядаем канспект лекцыі па грамадазнаўству, але ў ім, як кажуць, «ні сучка, ні задоркі». Тэма — «Днепрадзэс». У канспекце падрабязна распісвала мэтавая ўстаноўка лекцыі, увесь ход яе, метады і дыдактычны матэрыял.

Якую-ж мэту ставіла т. Фурман, ідучы на гэту лекцыю?

Даць дасканала акрэслены аб'ём ведаў аб Днепрадзэсе: геаграфічнае палажэнне электрастанцыі, прынцыпы набудовы, значэнне не для індустрыялізацыі і абароны краіны; даць элементы антырэлігійнага і інтернацыянальнага выхавання на даным матэрыяле.

Знаходзім з настаўніцай у клас і адразу бачым, як клапаціва быў ёю падабраны дыдактычны матэрыял. На сцяне вісяць дзве геаграфічныя карты — карта СССР і карта электрыфікацыі СССР. У папцы, што ляжыць на стале, — шмат выразак маю ніцкай з часопіса «СССР на стройке». Настаўніца выкарыстала і такія матэрыялы, як вытрымку з газеты «Ротэ фане» пра пуск Днепрадзэса і некаторыя вершы, прысвечаныя Днепрабуду.

Тав. Фурман так майстэрскі праводзіць уступную гутарку, прысвечаную паўтарэнню прапрацаванага матэрыяла, што гэта паўтарэнне адначасова служыць падрыхтоўкай да сённяшняй тэмы. Уступная гутарка заняла роўна пяць хвілін, як і было прадугледжана ў канспекце.

Настаўніца ставіць пытанне:

— Які гэта камбінат. Урала-Кузнецкі?

— Гэта камбінат жалеза і вугалю, — адказвае выкліканы вучань.

— Ці-ж толькі там вугаль і жалеза?

— Не, там ёсць яшчэ заводы сельска-гаспадарчых машын, хімічная вытворчасць.

— У якіх гарадах?

— У Чэлябінску, Новасібірску...

Настаўніца не задавальняецца прамільнымі адказамі дзяцей. Яна хоча яшчэ ўпэўніцца, ці ведае вучань геаграфічную карту. Выкліканы вучань хутка і правільна паказвае на карце гарады Урала-Кузнецкага камбіната. Потым настаўніца шляхам пытанняў успамінае з дзецьмі гіганты хімічнай прамысловасці, пабудаваныя за першую пяцігодку.

Вучні ведаюць не толькі што такое Бобрыкі і Березняки, але без памылак адказваюць, якой сыравінай базай карыстаюцца гэтыя волаты хімічнай прамысловасці.

— Ну, а што патрэбна для таго, каб гэтыя гіганты працавалі?

Вучань: трэба мець энергію, якая-б рухала машыны і варштаты гэтых гігантаў. Нам патрэбны электрастанцыі і мы будуем шмат электрастанцый, — дадае вучань.

Настаўніца вельмі ўдала і проста падкрэслівае ролю Владзіміра Ільіча Леніна, як ініцыятара электрыфікацыі Совецкага Саюза. Вучні ведаюць, што В. І. Ленін быў не толькі ініцыятарам электрыфікацыі, але і тое, што па яго загаду была ў 1921 годзе створана камісія, якая распрацавала першы план электрыфікацыі РСФСР, і што гэты план пачаў ажыццяўляцца яшчэ пры жыцці тав. Леніна.

Пасля гэтага пераходу да тэмы лекцыі т. Фурман каротка знаёміць дзяцей з мэтавай устаноўкай:

— Сёння мы пазнаёмімся з адной з велізарнейшых нашых пабудоў — з Днепрадзэсам. Сама назва Днепрадзэс (настаўніца пры гэтым расшыфроўвае з вучнямі слова Днепрадзэс) гаворыць аб тым, што гэта электрастанцыя знаходзіцца на р. Днепро.

Паказваючы на карце гэту раку і Днепрадзэс, настаўніца ў даступнай дзецям форме тлумачыць не толькі, праз якія рэспублікі працякае Днепр, але і тое, што ў ніжнім цячэнні ракі ёсць раёны, багатыя рознымі выкапнямі.

Далей яна каротка, але ярка спыняецца на гісторыі днепроўскіх парогаў. Тут у даступнай дзіцячаму разуменню форме прывядзіцца вучням элементы антырэлігійнага выхавання. Дзецям становіцца нават смешна, што іх далёкія продкі вельмі пужаліся днепроўскіх парогаў. Адзін вучань кажа:

— Лодкі разбіваліся аб парогі ад вельмі хуткай плыні, а людзі думалі тады, што гэта губіць іх нейкая таемная сіла...

— Раней пры царах у Расіі таксама думалі пабудаваць плаціну і электрастанцыю, рабілі нават і праекты, але электрастанцыя не была пабудавана.

Настаўніца падкрэслівае кантраст паміж «тады» і «цяпер», яна паказвае, што «тады» было немагчыма, але зараз рабочыя пад кіраўніцтвам большэвікоў і не такія цуды могуць зрабіць, што толькі краіна пролетарскай дыктатуры змагла пабудаваць Днепрадзэс.

— Большэвікі ўзяліся моцна за справу. Мы пачалі будаваць Днепрадзэс у 1927 годзе і пусцілі яе ў 1932 годзе.

Настаўніца паказвае вучням рад малюнкаў Днепрадзэса, партрэты лепшых ударнікаў рабочых і інжынераў-будаўнікоў гэтага гіганта, фотаздымкі плаціны, шлюза, электрастанцыі. Вучні з прагавітасцю разглядаюць малюнкі.

Сваю гутарку т. Фурман ілюстравала не толькі малюнкамі з часопіса «СССР на стройке»; яна прачытала дзецям невялічкія вершыкі пра Днепрабуд.

Чытанне паэтычнага матэрыяла захапляе дзяцей. Яны слухаюць з вялізарнай увагай.

—Ітак, дзеці, велізарная станцыя пабудавана. Вада падняла, заліла парогі. Іх больш не відаць, яны ўжо больш не страшныя, і параходы спакойна плаваюць там, дзе раней не было праходу для лодак. Вада завярнула турбіны і...

— Атрымаўся ток, які пабег па дротах, — перабіў вучні настаўніцу.

Пасля высвятлення з дзяцьмі пабудовы гіганта першай пяцігодкі, настаўніца пераходзіць да растлумачвання значэння Днепрадзэса, паказвае вучням схему электрастанцыі, ад якой ідуць дроты, а па баках на маляваны галоўныя прадпрыемствы Днепракамбіната.

Вучні даведваюцца ад настаўніцы, што каля Днепрадзэса пабудован рад велізарнейшых гігантаў-заводаў: метадургічны завод, найвялікшы ў свеце алюміневы завод і інш.

Ток Днепрадзэса рухае машыны заводаў Днепракамбіната, ім у калгасах малоцяць зярно, ён запальвае электрычныя лямпачкі ў хатах калгаснікаў. Рака Днепр стала судаходнай. Настаўніца расказвае, што Днепрадзэс мае вялікае значэнне для абароны краіны: на заводзе-гіганце з дапамогай электрычнасці мы выраблем алюміній, які патрэбен для пабудовы самалётаў.

Настаўніца разам з вучнямі падагульняе прапрацаваны матэрыял, растлумачвае інтэрнацыянальнае значэнне Днепрадзэса.

— Не толькі рабочыя і калгаснікі краіны Совецкага радуюцца Днепрадзэсу. Рабочыя капіталістычных краін разам з намі радаваліся, калі магутная электрастанцыя была ўрачыста адкрыта. Вось я вам прачытаю, што пісалася ў газеце «Ротэ фане» з поваду адкрыцця Днепрадзэса.

«Днепрадзэс ёсць цвярдыня не толькі Совецкага Саюза, але рабочага класа усяго света. Гэта дасягненне нас бадзёрыць, нас радуе і дае нам смеласць у барацьбе з буржуазіяй»...

***

Прыклад гэтай лекцыі паказвае якое вялікае значэнне мае арганізацыя педагагічнага працэса не толькі для добрага засваення дзецьмі «асноў навукі», але і ў справе арганізацыі сядомай дысцыпліны ў групе. Сакрэт поспехаў тав. Фурман заключаецца ў добрасумленнай і глыбокай падрыхтоўцы да лекцыі.

ЗАЙЦАЎ, РЫВІН.

АБМЕН „АСАБІСТЫМІ ПІСЬМАМІ" ПАМІЖ ХІРОТА І ХЕЛЛАМ

НЬЮ-ЙОРК, 22 (БЕЛТА).

Апублікован тэкст «асабістых пісем», якімі абмяняліся міністр замежных спраў Японіі ХІРОТА з міністрам замежных спраў ЗША ХЕЛЛАМ з прычыны прыбыцця ў Вашынгтон новага японскага паслы Саіто.

Хірота ў пісьме ад 21-га лютага нагадвае, што прайшло ўжо 80 год з часу ўстанаўлення дагаворных адносін паміж ЗША і Японіяй. Хірота заяўляе, што ў галіне знешняга гандлю «толькі нямногія японскія і амерыканскія тавары канкуруюць», і выказвае ўпэўненасць, што паміж ЗША і Японіяй «няма праблемы, вырашэнне якіх было-б прыцыпова трудным». — Усе пытанні, — заяўляе далей Хірота, — існуючыя або маючыя ўзнікнуць у будучым, «несумненна могуць быць вырашаны мірнымі сродкамі, калі толькі абедзве краіны падыйдуць к пытанням з належным узаемаразуменнем, шчырасцю і ў духу прымірэння».

Хірота ўказвае, што «Японія нічыць сваім асноўным прынцыпам мірнае і гарманічнае супрацоўніцтва з усімі краінамі і не мае ніякіх намераў выклікаць сваркі з якой-бы там ні было другой дзяржавай». — Пры гэтым,— піша Хірота, — Японія «асабліва жадае культываваць і забяспечваць мірныя і брацкія адносіны з Амерыкай» і выказвае надзею, што ўрад ЗША адкажа ўзаемнасцю.

У сваім адказе Хелл запэўнівае, што цалкам згодзен з тым, што паміж ЗША і Японіяй няма пытанняў, якія не могуць быць вырашаны мірнымі сродкамі. Хелл піша, што ўрад ЗША гатоў у выпадку ўзнікнення разгалассяў паміж Японіяй і ЗША «вывучаць пазіцыю Японіі ў духу дружбы і жадання мірнага і справядлівага вырашэння ўсіх пытанняў, чакаючы з упэўненасцю, што японскі ўрад у сваю чаргу гатоў будзе вывучаць пазіцыю ЗША ў тым-жа духу».

Далей у пісьме гаворыцца: «Вы катэгарычна заяўляеце, што ў Японіі няма ніякіх намераў выклікаць нязгоду з якой-бы там ні было другой дзяржавай. Гэту заяву я прымаю з асаблівым задаваленнем». Хелл выказвае надзею, што «акажацца магчымым для ўсіх краін, якія маюць інтарэсы на Далёкім Усходзе, падыйсці да ўсіх пытанняў, існуючых і маючых узнікнуць паміж імі, у такім духу, каб гэтыя пытанні маглі быць уладжаны і вырашаны без шкоды для каго-б там ні было і з канчатковай і доўгай выгадай для ўсіх».

У заключэнне Хелл выказвае гатоўнасць атрымаць ад японскага ўрада любую прапанову, разлічаную на захаванне і ўмацаванне «дружбы і сардэчнасці», якія характарызуюць 80-гадовыя адносіны паміж двума краінамі. Хелл запэўнівае, што аднясецца спрыяюча да ўсякай меры, «разлічанай на ажыццяўленне гэтай мэты, якая можа адначасова дапамагчы мірным адносінам, аснаваным на добрай волі к усеагульнаму добрабыту ўсіх насяляючых землю народаў».

ЯПОНСКАЯ ПАЗІЦЫЯ У МОРСКІХ УЗБРАЕННЯХ

КАМЮНІКЕ МОРСКАГА МІНІСТЭРСТВА ЯПОНІІ

ТОКІО, 23 (БЕЛТА).

Морскае міністэрства апублікавала камюніке, у якім катэгарычна абвяргае паведамленне, што Японія ў выпадку прызнання ЗША Манчжоу-Го і прадастаўлення незалежнасці Філіпін згодзіцца з захаваннем існуючых зараз квот морскіх узбраенняў.

Камюніке падкрэслівае, што «рашэнне японскага флота патрабаваць перагляду пяцярэшніх квот астаецца незменным».

Газеты адзначаюць, што ў морскіх колах не намераны асабліва каментаваць апошнюю заяву Свенсона, што «амерыканскі флот настойвае на абмежаванні морскіх узбраенняў па асобных катэгорыях караблёў, лічачы, што погляды японскага флота па даному пытанню вядомы і зусім разыходзяцца з поглядамі Свенсона.

«Іоміуры» і «Дзі-дзі» падкрэсліваюць, што хоць морскае міністэрства і міністэрства замежных спраў адчадушны ў сваім рашэнні дабівацца скасавання існуючых квот, але пакуль канчаткова не вырашана, у якім парадку будуць праводзіцца дыпламатычныя меры па ажыццяўленню гэтага рашэння. Устаноўлена толькі, — пішуць газеты, — што Японія павінна да склікання морскай канферэнцыі ў 1935 г. пачаць папярэднія перагаворы з ЗША і Англіяй.

Паводле слоў «Дзі-дзі», Мацудай ра і Саіто ўжо прапанавана японскім міністэрствам замежных спраў зандыраваць глебу ў Лондане і Вашынгтоне наконт магчымасці палітычнага вырашэння пытання аб морскіх квотах. У «парадку падрыхтоўкі к палітычнаму рашэнню» — піша газета, — кіраўнікі морскага і ваеннага міністэрства, а таксама міністэрства замежных спраў абмяркоўваюць наступныя пытанні, якія, на іх думку, звязаны з вырашэннем праблемы аб морскіх узбраеннях: 1) заключэнне япона-амерыканскага пакта аб арбітражы, 2) устанаўленне нейтральнай зоны ў Ціхім акіяне, 3) расшырэнне пагаднення аб умацаванні ў Ціхім акіяне, 4) скасаванне морскіх і ваенных баз на Філіпінах і заключэнне пагаднення аб гарантыях незалежнасці і нейтральнасці Філіпін, 5) прынцып «адкрытых дзвярэй і роўных магчымасцяй» на Далёкім Усходзе. Газета дадае, што японскія ўлады лічаць таксама необходзным забяспечыць прызнанне ўсім светам Японіі ў якасці стабілізуючай дзяржавы на Ўсходзе «і кіравацца гэтым прынцыпам у вырашэнні ўсіх пытанняў». «Іоміуры» дадае, што морскія ўлады лічаць неабходным дабіцца забароны прабывання атлантычнага флота ЗША ў Ціхім акіяне.

Аўтэнтычнасць паведамленняў газет «Дзі-дзі» і «Іоміуры» становіцца зразумелай, калі ўлічыць сёнешняе паведамленне газеты «Тэйто ні ці-ніці». Апошняя ўказвае, што морскае міністэрства нядаўна парашыла «больш строга кантраляваць» паведамленні друку аб морскай палітыцы наогул, а таксама па ўсіх пытаннях, якія адносяцца да флота, і не дапускаць з'яўлення «якіх-бы там ні было паведамленняў, якія супярэчаць поглядам морскага міністэрства». Морскае міністэрства — піша газета—у далейшым наогул абмяжуе апублікаванне афіцыяльных заяў прадстаўніка морскага міністэрства з тым, што афіцыяльныя заявы будуць публікавацца пасля сумеснага разгляду з міністэрствам замежных спраў і «пасля дэтальнага вывучэння магчымых вынікаў падобных заяў за граніцай».

ПРАТЭСТ ГЕНЕРАЛЬНАГА КОНСУЛА СССР У ХАРБІНЕ Т. СЛАВУЦКАГА СУПРОЦЬ ПАГОРШАННЯ АБЫХОДЖАННЯ З АРЫШТАВАНЫМІ СОВЕЦКІМІ ГРАМАДЗЯНАМІ

ХАБАРАЎСК, 23. (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Харбіна, у апошнія дні совецкім грамадзянам, зняволеным у манчжурскай чыгуначнай паліцыі, забаронена перадаваць харчовыя прадукты ў цвёрдым выглядзе і наогул абмежаваны перадачы. Паліцыя не дапускае прадастаўляць належную медыцынскую дапамогу. Ёсць выпадкі збівання зняволеных. У сувязі з указаным зняволеным абвешчана галадоўка пратэсту. У якасці спосабу не ліквідацыі паліцыяй выбрана чэцвера зняволеных, якіх у якасці «зачынчыкаў» люта збіваюць. На ўсе звароты сваякоў і консульства СССР паліцыя адмоўчваецца, адмаўляючыся нават гаварыць.

21-га сакавіка генеральны консул СССР у Харбіне т. СЛАВУЦКІ наведаў дыпламатычнага агента Манчжоу-Го Шы Люй-бена і катэгарычна патрабаваў ад яго прыняцця эфектыўных мер для ліквідацыі агідніцтваў у чыгуначнай паліцыі ў адносінах арыштаваных совецкіх грамадзян і задавалення іх запатрабаванняў. Тав. Славуцкі патрэбаваў дапушчэння сустрэчы з зняволенымі прадстаўніка консульства.

Тав. Славуцкі адзначыў пастаянныя незаконамерныя акты чыгуначнай паліцыі і настойваў перад Шы Люй-бенем на вызваленні совецкай калоніі ад клопатаў чыгуначнай паліцыі і спынення такога парадку, калі чыгуначная паліцыя замяняе пракурорскія органы.

Шы Люй-бень абяцаў камандзіраваць свайго прадстаўніка для высвятлення становішча і тэрміновага даць адказ па заяве т. Славуцкага.

НАЛЁТ ПАЛІЦЫІ НА СОВЕЦКІЯ ШКОЛЫ Ў ХАРБІКЕ

Як паведамляюць з Харбіна, 19-га сакавіка група прадстаўнікоў манчжурскага «дэпартамента народнай асветы», суправаджаемая паліцэйскімі і ўзначальваемая японскім советнікам дэпартамента Такахасі, з'явілася ў тэхнікум КУЧ для дзяцей совецкіх чыгуначнікаў і патрабавала для прагляду школьную бібліятэку.

Уся бібліятэка тэхнікума ў колькасці каля 10 тыс. кніг была гвалтоўна ўзята і ўвезена на прагляд у дэпартамент. Узяты кнігі па дакладных навуках, творы класікаў і т. д.

Паліцыяй адначасова зроблен вобыск ва ўсіх пакоях тэхнікума. Паліцэйскімі ўнесена таксама абанементная кніга, у якую запісаны адрасы бучняў, узяўшых кнігі з бібліятэкі, прычым заяўлена, што інспектары дэпартамента будуць збіраць кнігі па кватэрах вучняў.

20-га сакавіка начальнік IV аддзела дэпартамента народнай асветы (совецкі грамадзянін, які ведае па дагаворы совецкімі школамі ў Манчжурыі) заявіў ад імя кіраўніка КУЧ т. РУДОГА пратэст начальніку дэпартамента народнай асветы супроць гвалтоўнага вываду бібліятэкі тэхнікума, вывазу, які парушае існуючыя дагаворы аб школах для совецкіх грамадзян у Манчжурыі. Усю адказнасць за страты, прычыненыя тэхнікуму, начальнік IV аддзела ўскладаў на манчжурскія ўлады.

СПЫНЕННЕ АНГЛА-ФРАНЦУЗСКІХ ГАНДЛЁВЫХ ПЕРАГАВОРАЎ

ПАРЫЖ, 23. (БЕЛТА).

Як паведамляе Гавас, англа-французскія гандлёвыя перагаворы былі спынены з прычыны адмаўлення Англіі знізіць пошліны на некаторыя французскія прамысловыя тавары. Англія адхіліла таксама французскую прапанову стабілізаваць да канца года існуючыя пошліны на гэтыя тавары. Перагаворы спынены на неабмежаваны час.

ВОДГУКІ СУСВЕТНАЙ ПРЭСЫ

АНГЛІЯ

ЛОНДАН, 23. (БЕЛТА).

Такінскі карэспандэнт «Морнінг пост», закранаючы абмен пісьмамі паміж Хірота і Хеллам, выказвае думку, што Хірота яшчэ невыпрацаваў практычнага шляху для палепшэння япона-амерыканскіх адносін, але што на аснове наведзеных ім справак ён прышоў к высновы, што можна весці перагаворы толькі па пытанню аб суадносінах флотаў.

Хірота, як думае карэспандэнт, у неафіцыяльным парадку ўжо зандыраваў глебу з цэлай высветліць, наколькі Англія і ЗША схільны абмяркоўваць гэта пытанне.

Закранаючы пытанне аб выхадзе Японіі ў Лігу нацый, карэспандэнт заяўляе, што Токіо настойвае ў якасці папярэдняй умовы на перагляде статута Лігі. Японскія патрабаванні ў гэтай галіне змяншаюцца, паводле слоў карэспандэнта, у 10 пунктах, якія сёння павінны быць апублікаваны ў «Джапан адвертайзер» за подпісам барона Сакатамо. У ліку гэтых пунктаў значыцца прыманне Манчжоу-Го, прад стаўленне Германіі роўнапраўя ва ўзбраеннях, скасаванне артыкула 16 статута (аб санкцыях супроць парушальнікаў міру) і ўвядзенне новага артыкула, у рэзультаце якога Кітай будзе выведзен з Лігі.

Указанне Хелла па повану «ўсіх краін, маючых інтарэсы на Далёкім Усходзе», газета расцэньвае, як прынцыповую дэкларацыю, што далёка-ўсходняя праблема мае міжнародны характар. У канчатковым выніку газета лічыць, што «гэтыя ўзаемныя запэўненні нічога не мяняюць у палітыцы абодвух дзяржаў».

ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 22. (БЕЛТА).

Амерыканскі друк ажыўлена каментуе абмен пісьмамі паміж Хірота і Хеллам. Уплывовая «Балтымор сен» заяўляе, што пры чытанні гэтых пісем трэба мець на ўвазе надыходзячую морскую канферэнцыю, на якой безумоўна будуць аб мяркоўвацца і дыпламатычныя пытанні.

«Абмен дыпламатычнымі прывітаннямі і дэкларацыямі аб мірных намерах, — піша газета, — па сутнасці не мае значэння». — Салаўя байкамі не кормяць, — прадаўжае газета, — аднак, з чыста знешняга боку абмен нотамі мае важнае значэнне. «Самым крытычным пытаннем, — прадаўжае газета, — з'яўляецца Манчжоу-Го. Стварыўшы Манчжоу-Го, Японія парушыла пакт Келлога і дагавор 9-ці дзяржаў, які гарантуе тэрытарыяльную цэласнасць Кітая. Той факт, што Японія прадаўжае праводзіць гэту сваю палітыку, не гледзячы на яўнае неадабрэнне міжнароднай грамадскай думкі, меў сваім вынікам сур'ёзней шыя ўскладненні, якія толькі былі ў апошнія гады».

«Асошыэйтэд прэс» падкрэслівае, што згодна нядаўніх заўленняў дзяржаўнага дэпартамента палітыка ЗША ў пытанні аб Манчжоу-Го астаецца без перамен.

КІТАЙ

ШАНХАЙ, 22. (БЕЛТА).

Усе кітайскія газеты, каментуючы абмен пісьмамі паміж Хірота і Хеллам, вельмі скептычна расцэньваюць магчымасць значнага палепшэння япона-амерыканскіх адносін і знішчэння супярэчнасцяй паміж ЗША і Японіяй.

Падкрэсліваючы, што Японія немінуча будзе парушаць усе абавязацельствы ў адносінах норм морскіх узбраенняў, у пытанні аб незалежнасці Філіпін, а таксама будзе трымаць закрытымі дзверы ў Манчжурыю для капіталаў і тавараў іншых краін, газеты перасцярагаюць ЗША супроць даверлівых адносін да Японіі.

ЯПОНІЯ

ТОКІО, 22. (БЕЛТА).

Агенцтва «Сімбун рэнга» і «Дэмпо цусін» у паведамленнях з Вашынгтона і Нью-Йорка ўказваюць, што палітычныя дасягі ЗША і амерыканская прэса вельмі стрымана каментуюць абмен пісьмамі паміж Хеллам і Хірота, «зусім не жадаючы надаваць гэтаму абмену вялікага значэння». «Сімбун рэнга» ў паведамленні з Вашынгтона прыводзіць заяву Хелла, што ён гатоў весці перагаворы з Японіяй аб морскіх узбраеннях пры ўмове захавання існуючай прапорцыі паміж флотамі ЗША, Англіі і Японіі.

ЗАЯВА ХЕЛЛА

ВАШЫНГТОН, 23 (БЕЛТА).

Міністр замежных спраў Хелл заявіў, што ў галіне япона-амерыканскіх праблем не прадбачыцца і не мяркуецца ніякіх дыпламатычных дзеянняў. Паводле яго слоў, усё, што к гэтаму адносіцца, прыведзе на ў пісьмах, якімі ён абмяняўся з Хірота. Другія прадстаўнікі міністэрства замежных спраў адмаўляюць, што Японія або ЗША выслалі нулі прапановы аб скліканні «ціхаакіянскай канферэнцыі або аб якіх-небудзь іншых перагаворах».

АНТЫФАШЫСЦКАЯ БАРАЦЬБА ФРАНЦУЗСКАГА ПРОЛЕТАРЫЯТА

ПАРЫЖ, 23. (БЕЛТА).

Адбыўся трохтысячны сход комуністаў Парыжскай вобласці. Старшынствуе КАШЭН. Яму была на ладжана бурная авацыя. Кашэн паведаміў аб поспехах кампаніі вярбоўкі новых членаў у кампартыю і аб павялічэнні тыражу «Юманіта».

Ён указаў, што французскія комуністы павінны кіраваць масамі, прымяняючы тактыку адзінага фронта і строга захоўваючы партыйную дысцыпліну. Ад імя палітбюро французскай кампартыі выступіў Торэз, падкрэсліўшы необходнасць змагацца супроць сектанцкіх памылак і апартуністаў унутры кампартыі. Сход адногласна прыняў рэзалюцыю, адпавядаючую палажэнням да клада Торэза.

***

ПАРЫЖ, 23. (БЕЛТА).

Кашэн атрымлівае многа пісем ад рабочых, якія заяўляюць аб сваёй гатоўнасці ўзмацніць рэволюцыйную барацьбу пад кіраўніцтвам компартыі і ахоўваць Кашэна і іншых комуністычных кіраўнікоў ад фашысцкіх забойцаў.

***

ПАРЫЖ, 22. (БЕЛТА).

У Булоне адбылася 2-тысячная антыфашысцкая дэманстрацыя рабочых. Дэманстранты разагналі сход фашысцкіх арганізацый, які праходзіў пад аховай паліцыі. Дэманстранты агалашалі лозунгі: «Няхай жывуць советы!», «К'яппа ў турму!». Адбыліся сутычкі паміж паліцыяй і дэманстрантамі. Паліцыя ранила многа рабочых і арабіла многа арыштаў.

У Іерсе 1500 рабочых, у тым ліку сотні социялістычных, наладзілі дэманстрацыю са спевам «Інтэрнацыянала» і выгукамі «Няхай жывуць советы» і накіраваліся да будынку, дзе адбываўся сход фашысцкай арганізацыі «каранёўскія малодчыкі», які ахоўваўся паліцыяй. Фашысты выйшлі з будынка са зброяй у руках і правакавалі рабочых на сутычку. У рэзультаце сутычак ранены паліцэйскі і фашыст. Рабочыя прымусілі фашыстаў уцякаць.

У Марселі комуністычныя і социялістычныя рабочыя разагналі членаў фашысцкай арганізацыі, якія прабавалі арганізаваць сход у рабочым квартале. Выгнаўшы фашыстаў з залы, рабочыя правялі антыфашысцкі мітынг.

У Эрмоне тысяча рабочых на закліку мясцовай комуністычнай арганізацыі і рэволюцыйных профсаюзаў сабраліся ў зале, дзе павінен быў адбыцца сход членаў фашысцкай арганізацыі. Фашысты былі вымушаны адмовіцца ад правядзення сходу.

ПРАВАЛ ФАШЫСЦКАЙ ПРАВАКАЦЫІ

БЕРЛІН, 23. (БЕЛТА).

Закончылася слуханнем справа 6 комуністаў, якія абвінавачваліся ў падрыхтоўцы «масавага атручання штурмавікоў». Вярхоўны суд у Лейпцыгу прыгаварыў галоўнага абвінавачанага Хільграфа к 3-м гадам катаржных работ, двух другіх — к 2 гадам турмы кожнага і аднаго к году і 3 месяцам турмы, 2 апраўданы. Суд быў ВЫМУШАН ПРЫЗНАЦЬ, што працэс НЕ ДАКАЗАЎ наўнасці якога-небудзь плана арганізацыі атручання.

Гігант швэйнай прамысловасці

Фота Грыбоўскага (СФ)

Швэйная фабрыка «Спіг індустрыялізацыі» (Віцебск) з'яўляецца адным з буйнейшых у Саюзе прадпрыемстваў швэйнай прамысловасці. На здымку: агульны від адного з цэхаў фабрыкі.

ПАЛІТБОЙ УДАРНІКАЎ МЕНСКІХ ЗАВОДАЎ

26 сакавіка ў Доме комасветы адбудзецца палітбой паміж лепшымі ўдарнікамі заводаў «Большэвік», «Комунар», імя Варашылава і друкарні імя Сталіна, здаўшымі на «выдатна» грамадска-палітычны экзамен па пытаннях XVII з'езда ВКП(б).

Палітбой будзе трансліравацца па радыё ад 6 гадз. 30 мін. да 8 гадз. вечара.

Гаркам партыі прапанаваў усім парткомам і парторгам арганізаваць калектыўнае слуханне па клубах, на прадпрыемствах і ў рабочых кватэрах.

НОВЫ АЭРАКЛУБ

ОРША, 24.

У Оршы адкрыўся новы аэраклуб, які будзе базай для далейшага развіцця авіацыйнага спорта. 34 прадпрыемствы ўступілі ў юрыдычныя члены клуба.

Па раёну ўжо створаны тры пхаверных гуртка і 14 авіямадэльных.

Вялікую ролю ва ўкараненні масавага авіацыйнага спорта адыгрывае школа планерыстаў, адкрытая ў Оршы 4 месяцы назад. У планернай школе навучаюцца лепшыя ўдарнікі фабрык і заводаў. Яны прайшлі тэарэтычны курс і зрабілі да 500 палётаў.

IV-ы пленум ЦЭНТРАЛЬНАГА СОВЕТА ПРОФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ

адкрываецца СЁННЯ, 25 сакавіка у 6 гадз. вечара,

у Доме Комасветы (рог. вул. Энгельса і К. Маркса)

Партгрупа пленума ў 5 гадз. у памяшканні ЦСПСБ, пакой № 14.

Рэгістрацыя будзе праводзіцца ў памяшканні ЦСПСБ (пакой № 14) 25 сакавіка з 10 гадз. раніцы да 4-х гадз. дня—у ЦСПСБ і з 6 да 8 гадз. вечара—у Доме Комасветы.

Удзельнікі пленума размяшчаюцца ў 2-й Совецкай гасцініцы (рог Совецкай і Комсамольскай вул.).

ПРЭЗ ЦСПСБ.

УВАГА: слухайце, слухайце, слухайце!

26 сакавіка ў 18 гадз. 30 хвілін Менгарком КП(б)Б, газета „ЗВЯЗДА" і Менскі гарадскі аддзел радыёвяшчання праводзяць радыё-грамадскі палітэкзамен „выдатнікаў"—палітбой чатырох прадпрыемстваў Менска: заводаў імя Варашылава, „Комунар", „Большэвік" і друкарні імя Сталіна.

З кожнага прадпрыемства ў радыёпалітэкзамене выдатнікаў прымаюць удзел па 5 чалавек, у тым ліку рэдактары шматтыражак.

Палітэкзамен будзе праходзіць у малой залі Дома Комасветы з удзелам шырокіх мас. Фабрычна-заводскія камітэты і парткомы, арганізоўвайце калектыўнае радыёслуханне палітэкзамена-палітбоя „выдатнікаў".

Менгарком КП(б)Б.
Рэдакцыя газ. «ЗВЯЗДА».
Менскі гарадскі аддзел радыёвяшчання

ЗАГАД

па Народнаму Камісарыяту Асветы БССР

15 сакавіка 1934 года г. Менск

Не гледзячы на катэгарычныя папярэджанні з боку Наркамасветы аб своечасовым прадстаўленні справаздачнасці па выдаткаванню фондаў зарплаты, большай часткай заг. АНА апошняя не прадстаўлялася як на працягу ўсяго 1933 года, таксама за студзень і люты месяцы 1934 года.

Асабліва безадказныя адносіны да справаздачнасці адзначаю в бюджэту заг. раёнАНА Лепельскага раёна тав. Фільмановіча, Віцебскага раёна тав. Ражанскага, Дубровенскага раёна тав. Шыповіча.

Папярэджваю ўсіх заг. раёнАНА, што да іх будуць ужыты суровыя меры спагнання аж да крымінальнай адказнасці паводле пастановы СНК СССР ад 27-XI 1933 г.

Прапаную заг. АНА прадставіць справаздачнасць аб выдаткаванні фондаў зарплаты за студзень і люты месяцы 1934 года, не пазней 25 сакавіка, у далейшым не пазней 15-га числа кожнага месяца па дадзенай раней форме.

Устаноўленых па штату статыстыкаў у АНА скарыстаць выключна на вучотна-статыстычнай рабоце, усклаўшы на іх непасрэдную адказнасць за ўсю пастаноўку статыстычнай работы.

НАРОДНЫ КАМІСАР АСВЕТЫ БССР ЧАРНУШЭВІЧ.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 8

Менскага Гарадскога Совета Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх дэпутатаў

21 сакавіка 1934 года г. Менск

АБ МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА БАРАЦЬБЕ СА ШКОДНІКАМІ ГАРАДСКОЙ ГАСПАДАРКІ Ў Г. МЕНСКУ.

На падставе пастановы Совета працы і абароны СССР ад 8-VIII 1932 г. за № 944 і пастановы СНК БССР ад 14-III 1934 г. за № 22 Менскі гарадскі совет Пастанаўляе:

1. Абавязаць усе дзяржаўныя, грамадскія, кааператыўныя установы і прадпрыемствы, жакты ЖБКТ і інш. вытвараць сістэматычную ачыстку сваіх жылых, нежылых памяшканняў, складаў, магазінаў, стайняў ад грызуноў (пацукоў і мышэй) і хатніх паразітаў праз беларускую апаратыўна-знішчальную станцыю пры ЦС АСО БССР.

УВАГА: у складскіх, гандлёвых і прамысловых памяшканнях утвараць абавязковую дэзінфекцыю.

2. Памянёныя ў п. 1 гэтай пастановы установы, арганізацыі, прадпрыемствы абавязаны заключыць з Беларускай апаратыўна-знішчальнай станцыяй дагавары на правядзенне мерапрыемстваў па барацьбе са шкоднікамі ў гарадской гаспадарцы і выконваць усе по распарджэнні і ўказанні.

3. Вінаватыя ў парушэнні гэтай абавязковай пастановы прыцягваюцца да адміністратыўнай адказнасці — штрафу да 100 руб. або прымусовым работам да 15 дзён.

4. Нагляд аб выкананнем гэтай пастановы ўскладаецца на Беларускую апаратыўна-знішчальную станцыю ЦС АСО.

5. Гэта пастанова уваходзіць у сілу праз 5 дзён з часу яе апублікавання.

Старшыня Менскага горсовета ЖУКОВІЧ.
Сакратар Менгорсовета КАПЕЛЕВІЧ.

ПАМЯШКАННЕ ПОЛЬСКАГА ДЗЯРЖ. ТЭАТРА

26 сакавіка АПОШНІ КАНЦЭРТ 26 сакавіка

ПРЭМ'ЕР ВЯЛІКАГА МАСКОЎСКАГА АКАДЭМІЧНАГА ТЭАТРА САЮЗА ССР.

АЛЕКСАНДР Батурын (бас)

Лаўрэатка Ленінградскай кансерваторыі Роза УМАНСКАЯ (скрыпка)

Салістка Вялік. акадэм. тэатра Саюза ССР Вера ДУЛАВА (арфа)

Б. ГОЛІКМАН (раяль)

Білеты ў рабочай касе і ў касе тэатра. Па заяўках—скідка.

Першы дзяржтэатр БССР (БДТ—1)

Мастацкі кіраўнік Літаўскай Л. М.

Сёння, 25 сакавіка па проспэру Мерыме „ЖАКЕРЫЯ"

трагедыя ў 4-х актах. Пачатак у 8 гадзін вечара.

РАДЫЁАДДЗЕЛ Беларускага кіраўніцтва сувязі

ПАВЕДАМЛЯЕ ўсіх абанентаў трансляцыйнай сеткі, маючых у сябе радыёкропак від радыёвузлоў, уваходзячых у сістэму Бел. кір. сувязі, што ўсе пакаёвыя радыёкропкі абанентаў павінны папраўляцца адпаведнымі радыёвузламі на працягу 20 гадзін у гарадскіх мясцовасцях з моманта прыняцця заявы на радыёвузле ад абанента і на працягу 35-ці гадзін у сельскіх мясцовасцях.

Радыёаддзел Бел. кіраўніцтва сувязі просіць абанентаў аб усіх выпадках не паладжання ў іх непрацуючых радыёкропак у вышэйказаны тэрмін па ведамляць непасрэдна ў РАДЫЁАДДЗЕЛ Бел. кір. сувязі па адрасу: Менск, Дом Урада, пакой 705.

Радыёаддзел Бел. кір. сувязі.

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ кіно-тэатр

Сёння і штодзённа мастацкі фільм

ПЕРАМОЖЦЫ

— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ —

ЦУДЫ ЦЕНЯЎ

Пачатак з 3-х гадз. дня.

СЕКТАР КАДРАЎ ВОСУ

арганізуе СЕМІНАРЫ па наступных дысцыплінах:

1. Метадалогія і методыка выкладання асноў бухгалтарскага ўчоту.
2. Аналіз гаспадарчай дзейнасці.
3. Тэхпромфінплан.
4. Бухгалтарскі ўчот і калькуляцыя ў прамысловасці
5. Нарматыўны ўчот.
6. Графічны метад учоту
7. Новыя формы крэдытавання ў кааперацыі і дзяржгандлі.
8. Прамысловая і гандлёвая статыстыка.
9. Калгаснае рахункаводства.
10. Судова бухгалтарскія экспертызы.

Заняткі вячэрнія—адзін раз у 6-днёўку. Тэрмін навучання ад 2 да 4 месяцаў. Аплата за курс ад 45 да 80 руб. Прыём па камандыроўках і індывідуальна.

11. Адзінагадовую групу планавікоў сярэдняй кваліфікацыі для прамысловасці без адрыву ад вытворчасці. Заняткі вячэрнія—4 разы у 6-днёўку. Плата 300 р. за ўвесь курс.

Прымаюцца памбухі і руканаводы першага разраду па камандыроўках.

Выдача даведак і прыём заяў у канцылярыі курсаў (Рэволюцыйная, 3, ва двары, тэл. 25-345) ДА 1-га МРАСАВІКА ад 12 да 2 гадз дня і ад 6 да 7 гадз. вечара.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Гукавы мастацкі фільм БЕЛАЯ СМЕРЦЬ У фае—гастролі ДЖАЗ БАНДА.

Кіно „Пролетарый". МАСТАЦКАЯ ДРАМА па раману Дюшэна „Та-Чілле" ЗА ШТО ЯЕ СУДЗІЛІ

КІНО Інтэрнацыянал — Замежны мастацкі фільм ПРАКУРОР ІЮРДАН драма ў 7 частках

Кіно „СПАРТАК". ПАТ І ПАТАШОН у замежнай комедыі ЗАГАДКА МЛЫНА ў 6 част

АНОНС! АНОНС!

„ПЕЦЕРБУРГСКАЯ НОЧ"

Школа ФЗВ пры Магілёўскай шоўкавай фабрыцы

абвяшчае НАБОР вучняў

па спецыяльнасці прадзільшчыкаў і матальшчыц.

У школу прымаюцца дзеці рабочых, калгаснікаў, беднякоў, сераднякоў і служачых. Узрост не менш 17 год і не больш 19 год. Адукацыя не менш 6-7 груп сямігодкі. Вучні забяспечваюцца стыпендыяй, інтэрнатам, сталовай і прадуктовымі карткамі па спісу 1-й кат.

Тэрмін навучання 6 месяцаў.

Заявы прымаюцца да 1 красавіка 1934 г. Да заяў патрэбна прыкласці дакументы: аб нараджэнні, аб адукацыі, соцстановішчы бацькоў, заверэную анкету, на адкрыта паштовых марак на 40 к. Без дакументаў заявы не разглядаюцца.

Адрас: г. Магілёў, быхаўскае шасе, барак 4, школа ФЗВ.

Загадчык ФЗВ АРЭНЗОН

Барысаўская Лесашкола „ЛПВ" Трэста „ЛЕСБЕЛ" абвяшчае НАБОР

у школу ў польвасці 80 асоб па наступным спецыяльнасцям:

Лесазнаёмлятэцыйны—60 ч.
2. Лесаводаў—30 чал.

Прыём з адукацыяй—5—6—7 груп сямігодкі.

Узрост не ніжэй 17 год.

Прынятыя забяспечваюцца стыпендыяй ад 45—75 р., снабжэннем па 1 спісу з 1 катэгорыі, сталоўкай і інтэрнатам.

Прыём заяў да 15 красавіка, пачатак заняткаў 20 красавіка 1934 г.

Да заяў неабходна далучыць: заверэную анкету, дакеску аб соц. становішчы бацькоў і сябе, метрыку, аб адукацыі і аб праве голасу.

Заявы з усімі дакументамі накіроўваць па адрасу: гор. Барысаў, Андрэеўская № 22, Лесашкола.

Дырэктар Лесашколы Гурчан.

Менск, друкарня «Звязды».

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Упоўн. Галіўлітбела № К—2529.